PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://www.kurier-poranny.com/niwa/

№ 19 (2348) Год XLVI | Беласток 13 мая 2001 г. | Цана 1,50 зл.

Студэнты беларусістыкі ў Гродне

Паўліна Шафран

Улады Беластоцкага універсітэта сарганізавалі экскурсію ў Гродна. Інтэграцыйнае падарожжа трывала ад 23 да 29 красавіка і ўдзельнічала ў ім амаль 20 асоб.

Экскурсія мела не толькі краязнаўчы характар. Студэнты прысутнічалі на занятках, якія штодзённа адбываліся ў Гродзенскім універсітэце. Слухалі яны лекцыі на тэмы беларускай лексікі, сучаснай беларускай літаратуры і граматыкі. Вялікае ўражанне на беластоцкіх студэнтах зрабіў спосаб выкладання. Энтузіязм у вачах, жэстыкуляцыя, адсутнасць нататак і натуральнасць ды шчырасць выказванняў не дазвалялі студэнтам нудзіцца ці з нецярплівасцю спаглядаць на гадзіннік. Найлепшым прыкладам гэтаму могуць быць заняткі прафесара Маляўкава, які, гаворачы пра п'есу Дударава „Радавыя", маналог аднаго з герояў выканаў з такой экспрэсіяй, што выклікаў слёзы ў студэнтак.

Пасля заняткаў студэнты аднадушна сцвердзілі, што такіх прафесараў у нашым універсітэце няма, што ніхто не меў бы праблемы са зданнем экзамена, бо хадзіў бы на заняткі не таму, што так яму загадалі, але таму, што сам бы хацеў. „Мне б сумленне не дазволіла прапускаць такія заняткі, чагось бы мне бракавала", — сказала студэнтка IV курса Кацярына Іванюк.

Студэнты не толькі вучыліся. Гродна аказалася цудоўным горадам, у якім прыхільнасць людзей аж здзіўляла. Жыхары Гродна, пачуўшы польскую мову, затрымоўваліся часта нават і пасярэдзіне вуліцы, і з радасцю віталі „землякоў". На жаль, ніхто не хацеў гаварыць са студэнтамі на беларускай мове, часам нават „па-хамску" звярталі ўвагу, што гэтай мовы ніхто не разумее і ніхто ёю не карыстаецца. „Госці з Беластока", як часта называлі студэнтаў, мелі магчымасць пабываць у Драматычным тэатры. Дзякуючы прафесару Міхалу Кандрацюку, паглядзелі мы спектакль паводле п'есы Дударава „Чорная панна", трапілі таксама і ў лялечны тэатр, і на канцэрт класічнай музыкі ў выкананні аркестра Гродзенскага універсітэта. Найбольшую цікавасць выклікала ў студэнтаў-экскурсантаў мерапрыемства „Студэнцкая вяс-

[працяг ☞ 3]

Якім будзе музей?

Аляксей Мароз

Удзельнікі Агульнага сходу членаў Грамадскага камітэта пабудовы музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы (ГКПМіАБК), які прайшоў 28 красавіка 2001 года ў музейнай кіназале, не заснавалі фонду музейнай дзейнасці, пра які гаварылася да з'езда. Прысутныя выбралі 15-асабовую ўправу Камітэта пабудовы музея і прынялі праграму будаўнічай і музейнай дзейнасці на найбліжэйшыя 3 гады. Тыдзень пазней Управа вылучыла прэзідыум з сямі чалавек. Старшынёю ГКПМіАБК стаў Ян Хіліманюк, а яго намеснікамі — Уладзімір Пятрочук і Мікола Клімюк.

Сход пачаўся з выбару вядучага пасяджэнне, якому старшынствавуў Мікола Клімюк і ўшанавання хвілінай цішыні памяці памерлых больш за 20 членаў ГКПМіАБК, у тым ліку Аляксандра Іванюка і Міколы Гайдука.

Дзеля музейнай дзейнасці

Са справаздачай і планам абсталявання музея выступіў намеснік старшыні ўправы Камітэта пабудовы музея Ян Хіліманюк. Паводле яго, неўзабаве пачнецца выкананне пастаяннай экспазіцыі. Падпісана ўжо дамова з мастаком Эдуардам Агуновічам з Мінска, які пасля 15 мая павінен прыехаць у Гайнаўку афармляць выстаўкі. Дамова заключана таксама з гайнаўскім этнографам Нэляй Шчукай, якая пачне сваю працу ад падрыхтоўкі і навуковай апрацоўкі экспанатаў звязаных з харчаваннем.

— Музей — гэта ў 80% навуковая дзейнасць, а толькі ў 20% выставачная. Каб паказаць нейкі экспанат, трэба спачатку сабраць пра яго інфармацыю і апісаць яго. Сучасны музей — гэта экспанаты і матэрыялы, якія тлумачаць прызначэнне вясковых прылад і спосаб іх вытворчасці. Неабходны відэафільмы, магнітафонныя плёнкі і дэталёвыя апісанні. Напрыклад, у музеях заходніх краін побач музычных інструментаў дэманструюцца відэафільмы, якія паказваюць ігру на іх. Апрача этнографаў да пастаяннай працы ў музеі патрэбны гісторыкі і мовазнаўцы, паколькі пастаянныя выстаўкі трэба мяняць кожныя 4-5 гадоў, — заявіла этнограф Нэля Шчука.

Намеснік старшыні ГКПМіАБК паінфармаваў, што на падрыхтоўку пастаяннай экспазіцыі спатрэбіцца каля 200 тысяч злотых. Гэтыя сродкі музей хоча атрымаць ад дзяржаўных, ваяводскіх і гмінных улад ды няўрадавых арганізацый. Зараз у музеі захоўваецца каля паўтары тысячы экспанатаў. У час дыскусіі ўдзельнікі сходу заклікалі збіраць экспанаты для музея. Выкананне пастаяннай экспазіцыі, якое пачнецца ў маі г.г., спачатку будзе весціся на ўласныя сродкі Камітэта. У зале, адведзенай на камерцыйныя і сезонныя выстаўкі, цяпер адбываюцца пасяджэнні вайсковай прызыўной камісіі. Ян Хіліманюк паказаў прысутным копію дамовы трыццацігадовай даўнасці паміж БГКТ і Акруговым музеем у Беластоку аб добраахвотнай перадачы яму экспанатаў з Этнаграфічнага музея ў Белавежы. Гэтыя экспанаты знаходзяцца цяпер у Сельскагаспадарчым музеі ў Цеханоўцы і зараз вядуцца перамовы аб вяртанні нявыкарыстаных імі беларускіх вырабаў і прылад.

Пра пабудову музея

Ян Хіліманюк звярнуў увагу на дзве вялікія грашовыя датацыі, перададзеныя на пабудову музея: дзяржаўную датацыю, якая была атрымана дзякуючы дамове, падпісанай у 1996 годзе паміж Камітэтам пабудовы музея, БГКТ і ваяводам, як прадстаўніком урада, якім кіраваў Владзімеж Цімашэвіч ды датацыю Польска-швейцарскай камісіі злотавых фондаў, атрыманую ў мінулым годзе (разам каля 1 мільёна новых злотых). Паінфармаваў ён таксама, што

[працяг ☞ 3]

Апошні рамантык Еўропы

Чытаючы вершы Зянона Пазьняка ў зборніку „Глёрыя Патрыя", можна зразумець, чаму аўтару не шанцавала ў палітычнай дзейнасці. Пазьняку цяжка прыходзіцца рацыянальна думаць пра Радзіму. Ён проста хворы на Беларусь, так як хворым бывае ўпершыню закаханы ў дзяўчыну юнак.

[палітык-паэт ☞ 4]

Выбарчы год

2001 год пяройдзе ў нашай дзяржаве пад знакам парламенцкіх выбараў. У дзейнасці БГКТ гэты ж год таксама будзе выбарчым годам, бо апрача парламенцкай кампаніі Таварыства рыхтуецца да справаздачна-выбарных сходаў перад XIV З'ездам БГКТ.

[пленум ГП БГКТ ☞ 4]

Абавязак працягваць вучобу

У статут нашай школы ўводзім запіс, што вучні, якія ў падставовай школе вучыліся беларускай мове, маюць абавязак працягваць вучобу ў гімназіі. Вызваленне вучня ад урокаў беларускай мовы можа адбыцца толькі па жаданні бацькоў.

[у Дубінах ☞ 5]

Беларуская Фінляндыя

У канцы зноў вярнуліся ў Браслаў, а дакладней на пляж, што акаляе Замкаву гару і частку горада. Возера Дрывяты, як сапраўднае мора, сцелецца па небакрай. Яго памеры — 10 кіламетраў даўжыні, 4 шырыні, агульная плошча 36 100 гектараў. На возеры шэсць невялікіх астравоў.

[падарожжа ☞ 9]

Хачу быць вясёлай аптымісткай

Мы з братам пайшлі шукаць маці, а немцы засталіся на панадворку. Неўзабаве вярнуліся адны. Маці не знайшлі. З-за вёскі ішла цётка Марыя Саснюк з ламаччам на плечах. Немцы прыкмецілі яе. Калі жанчына накіравалася на панадворак, яны рушылі за ёю.

[успаміны ☞ 10]

Бельскі Першамай

Большасць жыхароў Бельска адзначыла Першамай працай. Свабодны ад работы дзень людзі праводзілі на вёсках або на ўчастках. Прыгожая пагода спрыяла працы ў полі. 1 мая бяльшчане закладалі агароды, садзілі бульбу. Працавітым быў вольны ад работы дзень.

[святкаванне ☞ 11]

Беларусь — беларусы

Аляксандра Бергман з дачкамі Ленай і Зосяй (злева) і з апякункай Аннай Тыровіч (справа) — 1 мая 1996 г.

Аляксандры Бергман — 95!

1 мая Аляксандры Бергман споўнілася 95 гадоў з дня нараджэння. Юбілей прыгожы, бо мала каму суджана так доўга жыць, прытым амаль увесь час у XX стагоддзі, якое асабліва непрыхільным аказалася для яўрэяў. Ім у мінулым стагоддзі прыйшлося перажыць галакост — амаль татальнае знішчэнне нацыі. Аляксандры і Стэфану Бергманам ды іхняй дачушцы Зосі шчаслівы — можна сказаць — лёс падараваў жыццё, хаця не ў райскім шчасці, толькі ў разлуцы. Калі сёння чытаю пра кашмар лагернага жыцця сталінскіх часоў і генацыд яўрэяў падчас II сусветнай вайны, міжволі думаю: дзе тады лепш было быць яўрэю? Аляксандра Бергман у той час была ў сібірскіх лагерах. Так, яўрэйка ды камуністка была арыштавана ў Гомелі ў снежні 1935 г. Раней, напярэдадні ўгодкаў кастрычніцкай рэвалюцыі, быў арыштаваны яе муж — Стэфан, таксама камуніст. Ніхто на зважаў на тое, што ў іх было маленькае дзіця — Зося, якой у ліпені гэтага ж года споўніўся ўсяго годзік жыцця. З верай у камуністычныя ідэалы абое трапілі ў „рай". Іхнія біяграфіі — доказ таго, што і яўрэі камуністычных поглядаў не пазбеглі сталінскіх лагераў.

З выпадку 95-гадовага юбілею Аляксандры Бергман хочацца прыгадаць яе заслугі для Беларусі і яе гісторыі, бо гэта мне, як беларусцы, здаецца найбольш цэнным у яе жыцці.

Варта прыпомніць сённяшнім чытачам „Нівы", што ад пачатку 60-х і да пачатку 90-х гадоў на старонках тыднёвіка Аляксандра Бергман змяшчала артыкулы пра беларускую гісторыю міжваеннага перыяду і яе герояў. На працягу 30 гадоў у „Ніве" змяшчаліся яе артыкулы і лісты, знойдзеныя ёю дакументы і здымкі. Найбольш пісала яна пра Браніслава Тарашкевіча, якога выбрала героем сваіх архіўных пошукаў. Пісала таксама пра Івана і Антона Луцкевічаў, Леапольда Родзевіча, Сымона Рак-Міхайлоўскага, Ігната Дварчаніна, Максіма Бурсевіча, Уладзіміра Самойлу, Васіля Рагулю, Станіслава Шушкевіча. Даследавала міжваеннае грамадска-палітычнае жыццё: Беларускую сялянска-работніцкую грамаду, Беларускую рэвалюцыйную арганізацыю, Камуністычную партыю Заходняй Беларусі. Гэта з публікацый юбіляркі маладое пакаленне беларусаў пазнавала сваю нацыянальную гісторыю і вучылася метадалогіі біяграфічных і гістарычных пошукаў. Таксама варта згадаць пра яе публікацыі ў „Беларускіх календарах" і ў польскіх гістарычных навуковых часопісах — усяго разам каля сотні артыкулаў.

Гартаючы зараз „Ніву" з цікавасцю чытаю публікацыі Аляксандры Бергман. З перспектывы часу бачна, як яны падымалі інтэлектуальны ўзровень „Нівы": інфармавалі пра падзеі і асобы беларускага руху, а часам выклікалі мерытарычную палеміку. Думаю, што кожны, хто цікавіцца беларускім рухам, не можа абмінуць публікацыі Аляксандры Бергман. Яны трывала ўпісваюцца ў беларускую гісторыю, так як і іх аўтарка.

Біяграму Аляксандры Бергман можна знайсці ў „Энцыклапедыі гісторыі Беларусі", у працы „Яўрэі Гродна" пад рэдакцыяй Сяргея Піваварчыка, у біяграфічным слоўніку Аляксея Пяткевіча „Людзі культуры з Гродзеншчыны".

Таму ў падзяцы за тое, што Аляксандра Бергман зрабіла для „Нівы" і для беларусаў наогул на працягу трыццаці гадоў свайго прафесійнага жыцця з нагоды юбілею хочацца пажадаць ёй многа сілы і здароўя, асабліва цяпер, калі штодзень дакучаюць старасць і хваробы.

Лена Глагоўская

Фота Яўгеніі Шымчук

Андрэй Жукавец перад Апеляцыйным судом

2 мая адбыўся чарговы разгляд справы беларускага прадпрымальніка Андрэя Жукаўца (гл. „Ніва" н-ры 8, 12, 15 і 18). Рашэнне Акруговага суда ў Беластоку, які палічыў экстрадыцыю падсуднага ў Беларусь законнай, абскардзіў перад Апеляцыйным судом у Беластоку ягоны заступнік Ян Хайноўскі. Сам адвакат не мог прысутнічаць на разглядзе, аднак ён сам, так як і ўсе апошнія суб'екты судовага разгляду, у іх ліку і падсудны, згадзіліся разглядаць справу без Яна Хайноўскага; за Андрэя Жукаўца заступаўся цяпер толькі Здзіслаў Кішкель.

Абаронца звярнуў увагу, што ў Беларусі, якую на пачатку незалежнасці лічылі дэмакратычнай дзяржавай, адбылася эвалюцыя ўлады. Адзін чалавек захапіў усё, праследуючы праціўнікаў сваёй дыктатуры; пра гэта сведчаць рапарты міжнародных праваахоўных арганізацый. У Беларусі ствараюцца фіктыўныя юрыдычныя асновы дзеля крымінальных абвінавачванняў дзеячаў апазіцыі; найчасцей гэта абвінавачанні ў выманьванні і махлярстве. Але выступаюць там і іншыя формы знішчання апазіцыі — гінуць людзі і ніхто іх не шукае. Сына Тамары Віннікавай, якая атрымала палітычны прытулак у Вялікабрытаніі, мінскія ўлады абвінавацілі ў валоданні наркотыкамі. Сам Лукашэнка заявіў, што бярэ на сябе „адказнасць за вынікі судовых разглядаў" вялікіх эканамічных афёр. Чаму, — пытаў Здзіслаў Кішкель, — праследуецца толькі Андрэй Жукавец, калі не абвінавачваецца другі саўладальнік фірмы?

Падсудны, Андрэй Жукавец, звярнуў увагу, што ягоную экстрадыцыю ў Беларусь выкарыстала б рэжымная прапаганда, паказваючы, што дэмакратычная Польшча выдала апазіцыянера-злодзея. І перад восеньскімі выбарамі паказвала б, што апазіцыя, гэта банда злачынцаў. У адносінах да яго самога не было закідаў, пакуль банкі былі прыватныя. Як можна гаварыць пра выманьванне крэдытаў у 1997 годзе, — гаварыў ён, — калі органы, якія разглядалі справу, не арыштоўвалі яго да 1999 года? Я ніколі не хаваўся перад беларускімі судамі, хаця лічу, што з прыходам Лукашэнкі да ўлады ў Беларусі няма правасуддзя. А ў Польшчу я прыехаў, як у дэмакратычную дзяржаву, як да братоў.

Хаця ў абодвух выступленнях клаўся націск на палітычны кантэкст справы, Апеляцыйны суд не браў яго нават пад увагу, а засяродзіўся на фармальных хібах Акруговага суда. Апеляцыйны суд палічыў, што рашэнне Акруговага суда было прынята без вымаганага мінімуму следчых матэрыялаў для разгляду справы. Матэрыял з Беларусі абмяжоўваецца толькі да фармальнага звароту і копіі пракурорскага рашэння аб узбуджэнні крымінальнай справы. А польскі суд павінен выпрацаваць меркаванне, ці паводзіны падсуднага маюць прыметы незаконнага дзеяння; з беларускіх матэрыялаў пра гэта меркаваць немагчыма. Суд жа павінен высветліць, ці з пункту гледжання польскага заканадаўства закід мае характар крымінальнага злачынства, казначэйскага правапарушэння, ці дзеяння не парушаючага закон і на гэтай аснове меркаваць пра заканамернасць экстрадыцыі. Акруговы суд павінен звярнуцца ў Беларусь за мерытарычным папаўненнем экстрадыцыйнага звароту і толькі на аснове неабходных матэрыялаў будзе мог меркаваць пра дапушчальнасць выдачы Андрэя Жукаўца.

Апеляцыйны суд не вынес свайго рашэння па прычыне згаданай адсутнасці дакументаў, толькі адхіліў рашэнне Акруговага суда і вярнуў справу для паўторнага разгляду. Арышт Андрэя Жукаўца, які для экстрадыцыйнага разгляду неабавязковы, Апеляцыйны суд замяніў на паліцэйскі нагляд.

Аляксандр Вярыцкі

Па ўзроўню эканамічных свабодаў Беларусь на 129 месцы

У рэйтынгу 150 краін Беларусь па ўзроўню эканамічных свабодаў займае 129 месца, Украіна — 122, Расія — 117. Па дадзеных Heritage Foundation ацэнка аб'ёму эканамічных свабодаў у 150 краінах зроблена на падставе наступных крытэрыяў: гандлёвая палітыка, падаткі, умяшальніцтва дзяржавы ў эканоміку, у манетарную палітыку, у зварот капіталу, у палітыку адносна банкаў, аб'ём кантролю за коштамі, права ўласнасці.

Са 150 краін 72 аднесены да катэгорыі „свабодная ці амаль свабодная", 78 аднесены да краін з абмежаванымі свабодамі ў эканоміцы, з іх 18 — да краін з рэпрэсіўнай эканомікай. Згодна гэтаму рэйтынгу, Чэхія займае 11 месца, Эстонія — 25, Венгрыя — 64, Латвія — 69, Славакія — 77, Літва — 80, Польшча — 86, Румынія — 98, Балгарыя — 108, Албанія — 115.

Навіны Хартыі '97, 2 мая 2001 г.

Чытайце незалежную беларускую газэту ў Амэрыцы!

Газэта выходзіць штомесячна на 12-ці бачынах і каштуе 30 даль. лятунскаю почтаю...

Belarusian Digest
Беларускі Дайджэст

1086 Forest Hill, SE
Grand Rapids, MI 49546-3616

Mr. Nikolas Prusky, Publisher & Editor
Мікола Прускі, Выдавец і Рэдактар

Tel: 616.942.0108 • Fax: 616.942.6364

Пяць кандыдатаў у прэзідэнты аб'ядноўваюцца

Пяць вядомых палітыкаў — старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Уладзімер Ганчарык, экс-губернатар Гродзенскай вобласці, лідэр аб'яднання „Рэгіянальная Беларусь" Сямён Домаш, старшыня Камуністычнай партыі Беларусі Сяргей Калякін, экс-міністр абароны генерал Павел Казлоўскі і экспрэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Чыгір — заявілі 25 красавіка аб дасягнутай паміж імі дамоўленасці па каардынацыі дзеянняў для дасягнення агульнай мэты — перамогі на прэзідэнцкіх выбарах.

Аўтары звароту заклікаюць усіх грамадзян Беларусі аб'ядноўвацца дзеля будучыні Радзімы: „Толькі разам мы ў сілах змяніць жыццё да лепшага, забяспечыць для кожнага магчымасць зарабляць і законны парадак для ўсіх".

Хартыя '97, 3.05.2001 г.

На Брэстчыне з'явіўся яшчэ адзін часопіс

Яшчэ адно недзяржаўнае перыядычнае выданне з'явілася на Брэстчыне напярэдадні Дня друку, які адзначаецца 5 мая. Ім стаў гісторыка-краязнаўчы часопіс „Гістарычная брама", выдаўцом і рэдактарам якога з'яўляецца жыхар Бярозаўскага раёна Мікалай Сінкевіч. На працягу апошніх чатырох гадоў ён выдаваў аднайменны малатыражны бюлетэнь па гісторыі краязнаўства Брэстчыны, які і стаў асновай для стварэння часопіса. Чакаецца, што на яго старонках змогуць выказаць свой пункт гледжання краязнаўцы, гісторыкі, вучоныя. Напрыклад, матэрыялы стартавага нумару цалкам прысвечаны падзеям, якія адбываліся ў вобласці ў першай палавіне XIX стагоддзя. Выходзіць „Гістарычная брама" будзе адзін раз у квартал.

Іван Кукса, БЕЛТА

Якім будзе музей?

[1 ☞ працяг]
апошнім часам Камітэт атрымаў ад суайчыннікаў з Амерыкі 9 тысяч долараў, сабраных часопісам „Беларускі Дайджэст” і перададзеных яго рэдактарам Міколам Прускім. Будаўнікі музея зрабілі падлік, на падставе якога можна акрэсліць, што даравальнікамі сродкаў на Беларускі музей у Гайнаўцы былі: Міністэрства культуры Польшчы (713 тыс. зл.), Польска-швейцарская камісія злотавых фондаў (263 тыс. зл., а з сёлетняй датацыяй — 550 тыс. зл.), горад Гайнаўка (32 тыс. зл.), Гайнаўская гміна (29 тыс. зл.), Гайнаўскі павет (10 тыс. зл.), прыватныя асобы і ўстановы (363 тыс. зл.), ахвяравальнікі з Беларусі (104 тыс. зл.) і даход з гаспадарчай дзейнасці музея (108 тыс. зл.). Ян Хіліманюк паведаміў, што закончаны ўжо будаўнічыя працы ў выставачных залах і неўзабаве пачнецца тынкаванне звонку. Пра тэрмін заканчэння інвестыцыі прамоўца нічога канкрэтнага не сказаў. З дыскусіі вынікала, што можа яно адтэрмінавацца на многія гады.

Перавыбары і ўказанні

Новая ўправа выбрана была ў тайным галасаванні. З ліку 19 кандыдатаў, якіх запрапанавалі прысутныя, удзельнікам трэба было выкрасліць 4 прозвішчы. Ва ўправу выбраны былі: Аляксандр Баршчэўскі з Варшавы, Пётр Германюк з Аўгустова, Ян Сычэўскі з Беластока ды 12 прадстаўнікоў Гайнаўшчыны: Анатоль Ахрыцюк, Уладзімір Іванюк, Ян Карпюк, Ян Карчэўскі, Мікола Клімюк, Мікалай Нікалаюк, Уладзімір Пятрочук, Вольга Рыгаровіч, Васіль Сакоўскі, Ян Сухадола, Аляксей Харкевіч і Ян Хіліманюк. У рэвізійную камісію ўвайшлі: Уладзімір Юзвюк (Беласток), які стаў яе старшынёю, Хведар Галёнка (Варшава), Віктар Бура, Ілья Агіевіч і Ніна Прыступюк (усе з Гайнаўкі). У час з’езда быў зменены тэрмін паўнамоцтваў управы з 5 на 3 гады (у яўным галасаванні чатыры асобы супрацівіліся гэтай прапанове і адна стрымалася ад галасавання — на больш за 50 удзельнікаў). Яўным галасаваннем уведзены былі змены ў статут ГКПМіАБК, сярод якіх адна датычыць спынення дзейнасці ГКПМіАБК, якое можа адбыцца толькі на падставе пастановы Агульнага сходу яго членаў. Прысутныя, заслухаўшы выступленне старшыні рэвізійнай камісіі Уладзіміра Юзвюка, які станоўча ацаніў працу ўправы, адобрылі яе дзейнасць ды павысілі гадавую складчыну для членаў Камітэта пабудовы музея да 24 злотых.

Ва ўказаннях для ўправы ГКПМіАБК, прынятых у час пасяджэння, кладзецца націск на завяршэнне пабудовы музея, наладжанне пастаяннай экспазіцыі, збор экспанатаў і сродкаў на завяршэнне пабудовы, прыцягненне да дзейнасці ў музеі мастакоў беларускага паходжання, якія маглі б арганізаваць часовыя выстаўкі. Рэкамендуецца таксама весці асветную і культурную дзейнасць на аснове бібліятэкі і супрацоўніцтва з музеямі ў Польшчы і Беларусі. Прысутныя вырашылі, што дзейнасць Грамадскага камітэта абапірацца будзе, у галоўным, на гаспадарчай дзейнасці і запрапанавалі выступіць да польскіх мытнікаў з просьбай перадачы ў музей ікон, канфіскаваных у кантрабандыстаў у час гранічных кантроляў.

Будовай музея кіравалі Канстанцін Майсеня і Ян Хіліманюк.

У ходзе дыскусіі крытыкаваліся ўлады нашай краіны, якія спынілі дапамогу музею і Сеймік Падляшскага ваяводства, які дагэтуль не бачыць патрэбы дапамагаць пабудове музея ў Гайнаўцы. Пасол Сейма Ян Сычэўскі і радны Сеймікa Падляшскага ваяводства Ян Зенюк крытыкавалі палітыку ўрада і самаўрадавых ваяводскіх улад у адносінах да беларусаў. Хведар Галёнка з Варшавы звярнуў увагу на дыскрымінацыю беларусаў у Польшчы і прапанаваў выступіць з пратэстам у гэтай справе ў Еўрасаюз. Уладзімір Юзвюк у сваім выступленні безыменна абвінаваціў некаторых беларускіх дзеячаў у Польшчы ў абыякавым падыходзе да справы пабудовы музея.

Удзельнікі схода ўшанавалі ахвярную працу і адданасць для справы будовы музея Канстанціна Майсені, які з 1984 года старшыняваў Камітэту, збіраў сродкі і кіраваў будовай. Прысутныя стоячы ўзнагародзілі яго бурнымі апладысментамі і аднадушна прысвоілі яму званне ганаровага старшыні ГКПМіАБК у Гайнаўцы.

У час пасяджэння былі зачытаны пажаданні плённай працы ўдзельнікам схода ад маршалка Падляшскага ваяводства Славаміра Згжывы, а прысутны на сустрэчы консул Беларусі ў Беластоку Аляксандр Карачун да сваіх пажаданняў далучыў кніжны падарунак, які папоўніў кнігазбор музейнай бібліятэкі.

Аляксей Мароз
Фота аўтара

Пажары на Бельшчыне

У Бельскім павеце з году ў год расце колькасць пажараў, асабліва ў вясковай тэрыторыі. А галоўнай іх прычынай з’яўляюцца падпалы.

Паводле пажарнікаў, сельская гаспадарка — самы вогненебяспечны сектар. Тэхнічны прагрэс прынёс з сабой новыя крыніцы пажарнай пагрозы. Гэта перш за ўсё сельскагаспадарчая тэхніка і электрычнае абсталяванне. Значны ўплыў на вогненебяспечнасць у вёсках мае дэмаграфічнае становішча. Цяпер па вёсках многа пустых будынкаў, якіх практычна ніхто не пільнуе. У такіх умовах часта здараюцца падпалы або ненаўмыснае зацярушанне агню.

Апошнім часам наглядаецца рост колькасці пажараў у сельскай гаспадарцы. Вялікіх пажараў (калі згарэла больш за 3 клуні) на працягу апошняга трыццацігоддзя здарылася чатырнаццаць. Самы вялікі пажар успыхнуў у 1971 г. у Рудцы, у выніку якога згарэла 14 гаспадарчых будынкаў і адзін жылы. За гэты час у Арлянскай гміне здарылася пяць вялікіх пажараў, якія паглынулі 16 клуняў і 11 хлявоў. У Бельскай гміне ў чатырох пажарах пайшлі з дымам 13 клуняў, 8 гаспадарчых будынкаў і 3 дамы.

У 2000 годзе пажарнікі Бельшчыны выязджалі больш за 400 разоў да ўсялякага роду здарэнняў (на 100 разоў больш чым у 1999 годзе). У сельскай тэрыторыі пажарныя службы зафіксавалі 230 пажараў. З гэтага ліку ў 56 выпадках прычынай пажараў былі наўмысныя падпалы. Згарэла тады 29 клуняў, у тым ліку 10 збудаванняў было наўмысна падпаленых.

Падпалы будынкаў у прынцыпе здараюцца ноччу, лясоў — удзень. Падпальшчыкі — пераважна мужчыны ва ўзросце да 35 гадоў. Асобамі, якія пакутуюць ад хвараблівай цягі ўчыняць пажары, займаюцца псіхіятры.

У палове 1990-х гадоў у Бельскай гміне агонь падкладваў 17-гадовы юнак. У 5-кіламетровым радыусе ўзбудзіў ён 20 пажараў гаспадарчых пабудоў і лясоў. Трапіў ён за гэта ў турму.

Тры гады таму ў Ігнатках Вышкаўскай гміны падпальшчык падпаліў дом па заказе. Разлічваў ён на тое, што сляды ботаў прыкрые снег. І хаця падпальшчык у завею адышоў ад пажару на 7 км, паліцэйскія (без сабакі) нагналі яго. А ў адной гміне падпальшчыкам аказаўся... пажарнік-дабраволец.

Летась на Бельшчыне згарэла 29 клуняў, у тым ліку 10 было падпаленых наўмысна.

Часамі здараецца, што пажар учыняюць уладальнікі аб’ектаў. Напрыклад, сёлета адна бяльшчанка падпаліла свой мясны аптовы склад з мэтай выманіць кампенсацыю ад страхавой кампаніі.

Іншыя прычыны пажараў — дэфектная электраўстаноўка, незабяспечаныя электрапрыборы, няшчыльныя комінныя трубы, трыманне апалу пры печах і неасцярожнасць людзей.

Паліцыя і пажарнікі вывучаюць прычыны кожнага пажару. Класічныя падпалы распазнаюць яны адразу. У складаных выпадках да высвятлення справы прыцягваюцца эксперты.

Міхал Мінцэвіч
Фота аўтара

Студэнты беларусістыкі ў Гродне

[1 ☞ працяг]
на” — падобнае на нашы ювеналіі.

Студэнты наведалі музей Максіма Багдановіча і Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці, па якіх абводзіў сам дырэктар Аляксандр Лойка. Пазнаёміліся мы з экспазіцыяй скураных вырабаў народных мастакоў-аматараў і з ткацкай майстэрняй.

Студэнты сустрэліся ў Гродне з консулам РП. Мы здзівіліся, што на пасадзе прадстаўніка польскай дзяржавы знаходзіцца асоба, якая не ўмее гаварыць на беларускай мове. Дыпламат не адказаў да канца на ніводнае наша пытанне. Усміхаючыся, зводзіў нас на іншыя тэмы, з ласкавасцю слухаў наступных пытанняў і лавіў захапленне гасцей (выкліканае магчымасцю прабывання ў такім прадстаўнічым месцы). Спатканне з консулам падсумаваў адным сказам адзін са старэйшых студэнтаў:

„Цяпер вядома, на што ідуць грошы падаткаплацельшчыкаў”.

Тыднёвае падарожжа па Гродне зрабіла вялікае ўражанне на беластоцкіх студэнтах. Ці ўзбагаціла іх душэўна? Можа, але да канца невядома. Аднак некаторыя лічаць, што калі няма магчымасцей развівацца ў сваім пачуцці беларускасці на Беларусі, будзем гэта рабіць на Падляшшы. Гэта дасць, калі не большы эфект, то напэўна задавальненне.

Паўліна Шафран
Фота аўтара

Пазьняк-паэт у Беластоку

Зянон Пазьняк зноў задзівіў сваіх сімпатыкаў і ворагаў. 27 красавіка г.г. палітык наведаў беластоцкую Кафедру беларускай культуры, гэтым разам як паэт і фатограф. Нагодай для сустрэчы стаў мастацкі альбом „Глёрыя Патрыя", выдадзены Таварыствам беларусай культуры ў Літве ў 2000 г. Спатканне праходзіла ў рамках інтэрдысцыплінарных семінараў, вядомых таксама як „беларускія чацвяргі".

— Я сёння буду гаварыць пра пытанне, ад якога залежыць нашае існаванне, — пачаў госць. — Як гісторык, я бачу на працягу апошніх 300 гадоў мэтанакіраванае знішчанне Беларусі. Яно пачалося ў палове XVIII ст., і кончылася занікам нацыі, мовы, культуры.

Затым пайшлі разважанні пра этнацыд, лінгвацыд і генацыд.

— Для таго, каб бараніцца, — гаварыў госць, — каб нацыя выжыла, мы павіны весці палітычнае змаганне. — Аднак як бы мы не змагаліся — нічога не вырашыцца без эканоміі і культуры. Каб бараніцца, нацыя павінна жыць паўнавартасным жыццём. А ў Беларусі ад трохсот гадоў ні адно пакаленне не дасведчыла жыцця ў сваёй незалежнай дзяржаве.

На пытане чаму беларускія палітыкі з'язджаюць з Беларусі, Пазьняк адказаў:

— У змаганні важная не толькі перамога, але і ўмеласць уцякаць ад пагрозы. У Беларусі мяне чакала фізічнае знішчэнне. Сёння, калі там гінуць тысячы, мы абавязаны думаць пра асноўнае — захаванне жыцця. Мёртвы палітык не дапаможа краіне.

Зянон Пазьняк дадаў, што з цягам часу вернецца ў Беларусь, што ягоная праца на эміграцыі спрычыніцца да незалежнасці Бацькаўшчыны.

* * *

— Толькі паэты так сурова і праўдзіва ўмеюць ацаніць рэчаіснасць. Яны сумленне народа, — гаварыў пра зборнік Пазьняка перакладчык Чэслаў Сэнюх.

— У кнізе „Глёрыя Патрыя" маем 442 паэтычныя пробліскі і пробліскі прасторы ў якасці першакласных фатаграфій. Здымкі, як і вершы Зянона Пазьняка, — рэцэнзаваў Сэнюх, — простыя, шчырыя, адкрытыя. У іх няма нічога з рэжысуры. Гэта паэзія і вобразы, якія мы можам заключыць красамоўнымі словамі — „Беларусь-Дабрарусь".

Сам аўтар так піша пра „Глёрыю Патрыю": *Гэтую кнігу фота-вершаў яшчэ ў 1995 годзе ўгаварыў мяне зрабіць пісьменнік Уладзімір Арлоў. Ён жа парупіўся выбраць тэксты са стосу колішняй маёй пісаніны. Я сабраў сякія-такія фатаграфіі, што неяк у мяне ацалелі (бо друкаваць спецыяльна з негатываў не меў часу ні магчымасцей), і тады мой даўні сябар мастак Пётра Драчоў скампанаваў кнігу. Дзесьці ў красавіку-траўні 1996 года яна павінна была ўбачыць свет. Але ў канцы сакавіка я апынуўся на чужыне, і ўсё спынілася. Мінулі дні і месяцы, гады змагання і цярпення. І тут я адчуў, якая дарагая мне гэтая страчаная кніжка: і тыя словы, што пісаў для сябе проста так, і старыя фатаграфіі, дзе былі вішні, дарогі ды шэры пыл...*

„Глёрыя Патрыя" Зянона Пазьняка ярка адлюстроўвае ўнутраны свет аўтара, яго глыбокае адчуванне паэзіі. Праўда, у вершах шмат маладзёвай наіўнасці і хвалявання. Такая ж свежая і прыгожая эстэтыка вобразаў. Падарожжа ў краіну вечна квітнеючых садоў... чароўныя тоні Браслаўскіх азёр. Пры гэтым балючае хваляванне за лёс Бацькаўшчыны.

— Чаму я заняўся палітыкай, — сказаў у канцы вершам госць:

1989 год
Ніхто не займаецца
сваёй справай.
Усе паглыбіліся ў палітыку.
Песні спяваў бы
на схіле гадоў.
Але змоўкні душа,
не іграй.
Прывід прускага барда
стаіць у ваччу
І жменя
пустых
арэхаў.

Натхненне для вершаў паэту дорыў жывы кантакт з Бацькаўшчынай. Цяпер на эміграцыі вершы не пішуцца, душа не хоча расслабіцца, — прызнаўся Пазьняк.

Ганна Кандрацюк
Фота аўтара

Апошні рамантык Еўропы

Чытаючы і праглядаючы кніжку Зянона Пазьняка *Глёрыя Патрыя**, якая з'яўляецца адначасова альбомам яго фатаграфій і зборам вершаў, можна зразумець, чаму аўтару не шанцавала ў палітычнай дзейнасці. Пазьняку цяжка прыходзіцца рацыянальна думаць пра Радзіму. Ён проста хворы на Беларусь, так як хворым бывае ўпершыню закаханы ў дзяўчыну юнак. Не веру, што поспехаў у палітыцы можа дачакаць чалавек, які піша: *Мілая Радзіма, Ты — уся мая памяць. Усё, што бачыў і перажываў за жыццё, усё, што пра Цябе чуў і чытаў і нават уяўляў — усё са мной. Ты, такая вялікая і прыгожая, перапоўніла маё сэрца і маю галаву* і далей *Глёрыя! Хвала! Хвала цвітучаму дрэву! Хвала зямлі і людзям...*

Пазьняка ведаю ўжо больш за 10 гадоў. Ён у публічных выступленнях заўсёды гаварыў тое самае, што ў прыватных размовах. Адну праўду меў для інтэлектуалаў і шырокай публікі. Звычайна гаварыў тое, што думаў, а гэта не найлепшая прыкмета для палітыка. Поспех у палітыцы забраніраваны цынікам, якія гатовы здрадзіць найлепшаму сябру, ідэі, за якую толькі што выказваліся, знішчыць тысячы людзей, каб дабіцца намечанай мэты. *В политике нет сентиментов*, — паўтараў стваральнік савецкай імперыі Іосіф Сталін. Увесь змест кніжкі паказвае, што Пазьняк з'яўляецца фанатыкам жыцця і бліжэй яму па натуры да лідэра экалагічнага руху, чым правадыра народа, які стаіць на ростанях і не ведае ў які бок павярнуць — да незалежнасці, ці каланіяльнага статусу. Лідэра другой арыентацыі народ мае ў асобе Аляксандра Лукашэнкі. Няма толькі чалавека, які мог бы пераканаць мільёны беларусаў да ідэі незалежнасці.

Узорам сучаснага палітыка, які напэўна не піша вершаў, а малапраўдападобна што іх калі-небудзь чытаў, з'яўляецца прэзідэнт Польшчы Аляксандр Кваснеўскі. Раней, аб чым амаль усе грамадзяне Польшчы ўжо забыліся, быў высокага рангу дзеячам камуністычнай партыі з крамлёўскага блаславення. Цяпер Кваснеўскі ўпэўнена вядзе народ і дзяржаву ў заходнееўрапейскія структуры і з'яўляецца вялікім прыхільнікам праамерыканскай вайскова-палітычнай арыентацыі. Пад яго кіраўніцтвам Польшча прымала ўдзел у вайне НАТО супраць Сербіі, некалькі дзён пасля прыняцця краіны ў рады гэтай ваенна-палітычнай арганізацыі.

Пазьняк разважае пра свет у катэгорыях маральнае — немаральнае, справядлівае — несправядлівае, хаця ў палітыцы няма месца на маральнасць. Ведае пра гэта кожны гмінны чыноўнік, кожны павятовы радны, а нават парафіяльны вікарны, толькі што ніколі пра гэта ніхто адкрыта не скажа.

Адно толькі ўпэўнена можна сказаць: Пазньяк як паэт і фатаграфік прадстаўляе найвышэйшы мастацкі ўзровень, аб чым я пераканаўся чытаючы і праглядаючы кніжку *Глёрыя Патрыя*.

Яўген Мірановіч

*Зянон, *Глёрыя Патрыя*, выд. Таварыства беларускай культуры ў Літве, Вільня 2000, сс. 350.

Выбарчы год

2001 год пройдзе ў нашай дзяржаве пад знакам парламенцкіх выбараў. У дзейнасці БГКТ гэты ж год таксама будзе выбарчым годам, бо апрача парламенцкай кампаніі Таварыства рыхтуецца да справаздачна-выбарных сходаў перад XIV З'ездам БГКТ. Да З'езда адбудуцца яшчэ справаздачна-выбарныя канферэнцыі ў паасобных аддзелах БГКТ. Вось гэтым дзвюм падзеям было прысвечана пашыранае пленарнае пасяджэнне Галоўнага праўлення БГКТ, якое адбылося 29 красавіка г.г. Удзельнічалі ў ім члены ГП, актывісты БГКТ з Беласточчыны, Варшавы і Гданьска, а таксама консул Рэспублікі Беларусь у Беластоку Аляксандр Карачун.

На пачатку пасяджэння прысутныя ўшанавалі хвілінай цішыні памяць памерлых найбліжэйшых асоб дзеячаў БГКТ: Барыса Навіцкага, Пётра Русачыка і Галены Нікалаюк. Першым пунктам пленума была тэма: „БГКТ у парламенцкіх выбарах 2001 г.". Старшыня ГП, пасол Сейма Ян Сычэўскі даў справаздачу аб сваіх пачынаннях і намаганнях у парламенце, яго камісіях і падкамісіях, звязаных з праблематыкай нацыянальных меншасцей (асабліва беларускай) у Польшчы. Сцвердзіў ён, што няма палітычнай волі для вырашэння многіх спраў для нацыянальных меншасцей. Асабліва не хапае добрай волі ў Падляшскім ваяводстве з боку ваяводы і ваяводскага сеймікa. Закранаў ён таксама праблему будовы беларускага музея ў Гайнаўцы. Будова памаленьку набліжаецца да канца, дзякуючы вялікаму заангажаванню ў яе дзеячаў і актыву БГКТ, а перш за ўсё членаў Грамадскага камітэта будовы музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы.

— Музей ужо будзе і гэта перамога беларусаў Польшчы над усімі непрыхільнасцямі. Музей — будучы навукова-асветны цэнтр — будзе сведчыць аб нашай беларускай годнасці і тоеснасці, — падкрэсліў старшыня ГП.

Пасол Ян Сычэўскі ў Сейме і на іншых форумах адстайваў таксама беларускія культурна-асветныя справы.

Па ініцыятыве Галоўнай рэвізійнай камісіі Прэзідыум ГП рэкамендаваў Яна Сычэўскага ў кандыдаты ў паслы на маючых адбыцца 23 верасня г.г. парламенцкіх выбарах. Пленум ГП адобрыў гэтую кандыдатуру і па прапанове старшыні ГРК Міхася Хмялеўскага аднагалосна прагаласаваў за тое, каб Ян Сычэўскі балаціраваўся ад беларускай грамадскасці ў новы Сейм.

Другой тэмай пасяджэння пленума ГП БГКТ была „Справаздачна-выбарная кампанія і падрыхтоўка да XIV З'езда БГКТ". Пленум вынес рашэнне, што на XIV З'езд БГКТ ад Беластоцкага аддзела павінна быць выбрана 25 дэлегатаў, Бельска-Падляшскага аддзела БГКТ — 15 дэлегатаў, з Варшавы — 5 дэлегатаў, ад Гайнаўскага аддзела — 25 дэлегатаў, з Гданьска — 3 дэлегаты, з Сакольскага аддзела — 7 дэлегатаў і з Сямятыцкага аддзела — 10 дэлегатаў. Канферэнцыі ў раёнах павінны адбыцца да 30 верасня, а З'езд БГКТ — 18 лістапада.

Наступнай тэмай пленума ГП БГКТ была „Ацэнка мінулагодніх мерапрыемстваў і планы да канца 2001 года", якую прадставіла сакратар ГП Валянціна Ласкевіч. Найбольшыя і найважнейшыя сёлетнія мерапрыемствы гэта: „Купалле" ў Белавежы (7.VII.2001 г.), Міжнародная навуковая канферэнцыя з цыкла „Дарога да ўзаемнасці" (20-22.VII.2001 г.) у Беластоку, Міжнародны фестываль польскай і беларускай песні „Беласток-Гродна" (22.VII.2001 г.) у амфітэатры ў Беластоку, Агульнапольскія прэзентацыі культуры нацыянальных меншасцей — XI Музычныя дыялогі над Бугам (11-12.VIII. 2001 г.) у Мельніку. Пленум прапанаваны план мерапрыемстваў ацаніў станоўча і аднагалосна адобрыў яго.

У дыскусіі выступілі: Ян Зенюк, Хведар Галёнка, Сяргей Крышань, Мікалай Сычэўскі, Мікалай Нікалаюк, Кастусь Масальскі і Анатоль Навіцкі. На канец пасяджэння, старшыня ГП Ян Сычэўскі паінфармаваў, што на працу ў ГП на штатнага працаўніка нядаўна прынята была Ева Ласкевіч.

Міхась Хмялеўскі

За школу ў Рыбалах

Управа горада і гміны ў Заблудаве на пачатку гэтага года вырашыла закрыць ад верасня Пачатковую школу ў Рыбалах. На ўсіх, хто звязаны з рыбалаўскай школай, гэтае рашэнне ўпала як гром з яснага неба. Пра намер, напрыклад, ліквідаваць школы ў Звярках і Кур'янах гмінныя ўлады інфармавалі тамашняе грамадства два гады раней, каб настаўнікі, бацькі і вучні мелі час і магчымасць пераставіцца на новыя ўмовы. Да таго ж гмінныя ўлады павінны былі справу закрыцця школы пракансультаваць з бацькамі і настаўнікамі, чаго ў Рыбалах не зрабілі. Падчас такіх кансультацый улады павінны запрапанаваць лепшыя ўмовы навучання ў новай школе. Рыбалаўскіх дзяцей гмінныя чыноўнікі рашылі перавесці ў школу ў Крыніцкіх, дзе ўмовы навучання горшыя, чым у Рыбалах. Праект пастановы аб ліквідацыі рыбалаўскай школы Управа горада і гміны Заблудава вынесла на галасаванне на апошнюю ў законным тэрміне (шэсць месяцаў да планаванага закрыцця школы) сесію Гмінна-Гарадской рады.

Бацькі рыбалаўскіх вучняў не пагадзіліся з пагардлівымі да іх адносінамі заблудаўскай управы. Такое стаўленне магло вынікаць і з добра вядомай ксенафобіі на Беласточчыне, якой некаторыя шасцідзесяцігадовай даўнасці праявы цяпер масава прарываюцца на шырокі свет. І ў Рыбалах гэта відаць, хаця б на прыкладзе тамашняга пажарнага дэпо, на якога пабудову матэрыялы ляжаць ужо дзесяткі гадоў, а гмінныя ўлады ў Заблудаве неяк не могуць знайсці сродкаў на здзяйсненне яго пабудовы, хаця на такія ж мэты ў небеларускіх вёсках такія сродкі знаходзяцца...

Школа ў Рыбалах з'яўляецца адзінай у Заблудаўскай гміне, дзе навучаецца беларуская мова. Вывучалі яе не ўсе дзеці, але на вестку пра планы заблудаўскіх чыноўнікаў, амаль усе бацькі тых, што яе не вучыліся, папісалі сваіх дзяцей на ўрокі роднай мовы. Бацькі дзе маглі, там пратэставалі. Падтрымалі іх і паслы Сейма Рэчы Паспалітай Владзімеж Цімашэвіч і Ян Сычэўскі. У лісце заблудаўскаму бурмістру Мечыславу Ладнаму напісалі яны м.інш. наступнае: *Likwidacja szkoły spowoduje niewątpliwie zagrożenie przyspieszonym, aczkolwiek nie zamierzonym przez samorząd, procesem wynaradawiania mniejszości, odrywania dzieci od ich naturalnych związków z kulturą ojczystą. Jest to zagrożenie, którego skutki są niewątpliwe (są na to ewidentne przykłady), a rozmiary trudne do przewidzenia, szczególnie na przestrzeni wielu kolejnych pokoleń. Mając na uwadze troskę o zachowanie najbardziej naturalnych warunków rozwoju dzieci i młodzieży w ich środowisku etnicznym, kierując się prawami mniejszości, wynikającymi m.in. z Konwencji Ramowej Rady Europy o ochronie praw mniejszości, którą Polska ratyfikowała, usilnie apelujemy o decyzję sprawiedliwą, korzystną dla mniejszości narodowej i religijnej mieszkańców wsi Ryboły i ich dzieci.*

У рыбалаўскай шасцігодцы вучыцца цяпер 55 дзяцей, паінфармавала мяне яе дырэктар Яўгенія Грыб. З канцом навучальнага года пакіне школу дзесяць выпускнікоў, якія цяпер у шостым класе. У першы клас у гэтым навучальным годзе прыйдзе пяцёра вучняў, у наступным прадбачваецца сямёра, за два гады адзінаццаць і за тры — сямёра. Невядома, ці гэтыя лікі ўтрымаюцца, бо выязджаюць з Рыбалаў працаўнікі мясцовага сельскагаспадарчага камбіната, які раней гадаваў курэй; сёння няма ўжо там курэй, меншае таксама лік рабочых і іх дзяцей.

Падчас сесіі Гмінна-Гарадской рады ў Заблудаве нязначная большасць радных выказалася супраць ліквідацыі рыбалаўскай школы. Такім чынам прадоўжыла яна сваё існаванне на чарговыя два гады. За сваю школу бацькі будуць змагацца, пакуль у ёй будзе больш чым трыццаць вучняў. А калі ўжо непазбежным стане перанясенне дзетак у іншую школу, тады мае гэта быць школа ў Заблудаве, а не ў Крыніцкіх.

Аляксандр Вярбіцкі

Якая новая матура?

У бягучым школьным годзе абітурыенты сярэдніх школ апошні раз здаюць экзамен на атэстат сталасці паводле старых прынцыпаў. І хаця час ад часу адбываліся нейкія мадыфікацыі ў змесце матуры, дык яе асноўная форма не мянялася.

Канцэпцыя новай матуры ўводзіць радыкальныя змены ў многіх яе аспектах. Форма экзамену накіраваная перад усім на праверку функцыянальных ведаў вучняў. Інакш кажучы, трэба ўмець выкарыстаць інфармацыі, зрабіць з іх адпаведныя вывады, ці правесці аналіз тэксту.

У пачатку бягучага навучальнага года паявіліся ў школах спецыяльныя інфарматары „Syllabusy", якія дэталёва знаёмяць з новай матурай. Можна разлічваць, што змест „Syllabusa" падрабязна ўжо разгледзелі найбольш зацікаўленыя — вучні і настаўнікі, таму і няма патрэбы моцна заглыбляцца ў яго. Варта толькі прыгадаць усім чытачам, што новая матура складаецца з дзвюх частак — унутранай (вуснай) і вонкавай (пісьмовай). Першая частка будзе адбывацца поўнасцю ў школе. Другая — будзе праводзіцца таксама ў школе, але пісьмовыя працы ацэньвацца будуць у акруговых экзаменацыйных камісіях.

Большасць прадметаў матурысты будуць здаваць на двух узроўнях — падставовым і расшыраным. Белліцэісты, так як і дагэтуль, будуць экзаменавацца па роднай мове ў вуснай і пісьмовай формах.

У апошні час паявіліся новыя распараджэнні, якія ўдакладняюць кшталт новай матуры. Такім чынам не толькі лаўрэаты, як інфармуе „Syllabus", але і фіналісты прадметных алімпіяд будуць звольнены з экзамену на атэстат сталасці па дадзеным прадмеце. Каб здаць матуру на падставовым узроўні, трэба набраць найменш 30 балаў (адыходзіцца ад традыцыйных ацэнак) на 100 магчымых.

Паявіліся таксама ўжо інфармацыі наконт тэрмінаў новай матуры 2002 г. З 8 па 26 красавіка будуць адбывацца ўнутраныя экзамены. Ад 6 мая да 6 чэрвеня будуць праведзены вонкавыя экзамены. Аб'яўленне вынікаў павінна наступіць да канца чэрвеня 2002 года.

Жадаем поспехаў!

Ян Карчэўскі

Абавязак працягваць вучобу



Выдатнікі па беларускай мове з настаўніцай Нінай Куптэль у этнаграфічным кутку.

— У статут нашай школы ўводзім запіс, што вучні, якія ў падставовай школе вучыліся беларускай мове, маюць абавязак працягваць вучобу ў гімназіі. Вызваленне вучня ад урокаў беларускай мовы можа адбыцца толькі па жаданні бацькоў, якія павінны з прашэннем асабіста прыбыць у школу і растлумачыць прычыны такога рашэння, — заяўляе ў пачатку размовы дырэктар Гімназіі ў Дубінах Тамара Крайнік.

У этнаграфічным і рэгіянальным кутках

У новым школьным будынку, які знаходзіцца на ўскраіне вёскі Дубіны, беларускай мове вучыцца пад 80% вучняў падставовай школы і больш за 30 гімназістаў. У адной з залаў падставовай школы наладжаны беларускі этнаграфічны куток „Скарбы нашай зямлі", дзе сабраны народная кераміка, тканіны, саламяныя вырабы і багаты беларускі кнігазбор. У ёй вядуцца заняткі па беларускай мове для малодшых і старэйшых класаў.

— З дапамогай спонсара, Надляснiцтва Гайнаўка, купілі мы стэлаж і перанеслі экспанаты, сабраныя школьнікамі з Дубін і Навасадаў. Настаўніцы Надзея Гаган і Ніна Куптэль абсталявалі куток, — інфармуе дырэктар Падставовай школы ў Дубінах Ніна Валкавыцкая.

У Гімназіі, у зале навучання гісторыі, арганізуецца рэгіянальны куток. У ім першапачаткова будзе наладжана выстаўка аб мінулым школ у Гайнаўскай гміне. Вучні пачалі выдаваць часопіс „Хохлік", у якім частка матэрыялаў будзе друкавацца на беларускай мове. Нядаўна Гімназія ў Дубінах прыступіла да Таварыства гімназій з малых мясцовасцей і вёсак, што дазволіць абменьвацца вопытам і дапамагаць сабе ў шуканні сродкаў.

— У нашу Гімназію хочуць прыйсці вучыцца некаторыя вучні з Гайнаўкі. Вернуцца да нас таксама дзеці з Дубін, якія вучыліся ў Падставовай школе № 2 у Гайнаўцы, — кажа дырэктар Тамара Крайнік. — Бацькі тлумачаць, што выбіраюць нашу школу, разлічваючы на адсутнасць у нас паталагічных з'яў, якія пашыраюцца ў горадзе. Прымаючы гарадскіх вучняў не будзем глядзець на іх вынікі ў вучобе, але на захаванне, каб пазбегнуць выхаваўчых праблем.

У падставовай школе і гімназіі вучыцца зараз больш за 200 вучняў. У наступным годзе іх колькасць павялічыцца на 40 асоб. Тады будзе працаваць па 6 аддзелаў у гімназіі і падставовай школе. Беларускай мовы вучыць у школе Ніна Куптэль і дапамагае ёй Надзея Гаган (у III класе ПШ).

На ўроках роднай мовы

— Вучні ахвотна працуюць на ўроках. Займаемся з падручнікамі, з якіх можна падабраць многа цікавага матэрыялу. Некаторыя вучні дома размаўляюць ужо па-польску, але для многіх дзяцей беларуская гаворка надалей застаецца роднай мовай. Гэты фактар выкарыстоўваем на ўроках. Вучні расказваюць пра сябе, свае сем'і і родныя вёскі. Гаворым пра калядныя, велікодныя і іншыя абрады, — паведамляе настаўніца Ніна Куптэль.

У школьных элімінацыях Дэкламатарскага конкурсу выступіла 9 асоб, на раённы агляд ездзілі 4 вучні, а Марта Леановіч з VI класа — на цэнтральны агляд. У конкурсе „Беларуская гавэнда 2001" удзельнічалі 3 асобы. Пашанцавала Анне Крук з VI класа, якая заняла III месца. Восенню моладзь з гімназіі паказала вечарыну „Восеньскія гульні". Гімназісты рыхтавалі навагодні спектакль на беларускай мове. Дзеці з III класа, пад кірункам настаўніцы Надзеі Гаган, ставілі спектакль „Стралец і рыбак", а цяпер рыхтуюцца да ўдзелу ў тэатральным конкурсе. Нядаўна моладзь выступала перад сваімі сябрамі са слоўна-музычным мантажом аб паталагічных з'явах. У Дубінах гасцявалі вучні з Нарвы. Паказалі яны калядныя абрады. Вучні II класа ездзілі з настаўніцай Нінай Куптэль у вёску Пераходы да бабулі Міхала Яноўскага, якая паказала ім кросны і расказала пра ткацтва. Зараз вучні рыхтуюцца запрасіць у школу фальклорны калектыў „Арэшкі" з Арэшкава, а 3 чэрвеня г.г., з нагоды Дня дзіцяці, плануюць арганізаваць у школе фэст для вучняў і бацькоў.

Пераможцы спаборніцтваў

Гімназісты занялі II месца ў Павятовым фінале Агульнапольскага турніру ведаў аб бяспечным дарожным руху, а вучні падставовай школы — III месца ў Футбольным турніры за кубак бурмістра Гайнаўкі. Дар'юш Кіндзюк заняў I месца ў мастацкім конкурсе, арганізаваным Надляснiцтвам Гайнаўка, а Івона Крук стала чэмпіёнам Гайнаўскай гміны па арфаграфіі (Марцін Сяменчык стаў чэмпіёнам пятых класаў, а Марк Паўлючук — чацвёртых).

Аляксей Мароз

Фота аўтара

Зорка

СТАРОНКА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Хрэсьбіны даўней

21 лютага г.г. мы, вучні пятага класа, урок беларускай мовы правялі ў спадарыні Зіны Гаўрылюк, якая расказала нам пра даўні хрысцінны абрад у Дубічах-Царкоўных. Даведаліся мы ад яе пра многа цікавых звычаяў і выслухалі некалькі песень, якія спяваліся на хрысцінах. Спадарыня Зіна нават зайграла нам на даўнім „інструменце”... валкаўніцы. Песні, вельмі вясёлыя, жартоўныя, накіраваны былі пераважна да бабкі-павітушкі, кумоў і бацькоў. Нашы продкі ўмелі вельмі цікава праводзіць час пры песнях, танцах і жартах!

Калісьці дзіця нараджалася дома і прымала яго бабка, якую звалі павітушкай, вельмі важная і шанаваная ў вёсцы асоба. Гэта яна першая трымала дзіця на руках, завівала яго ў пялюшкі, першы раз купала, апранала да хрышчэння, падавала дзіця кумам, каб завезлі яго ў царкву.

Цікавыя былі таксама звычаі, звязаныя з хрэсьбінамі. Напрыклад — каша, якую рыхтавала бабка ў чарапянай місцы. У кашу ўсе прысутныя на хрысцінах кідалі грошы. У падзяку атрымлівалі бабіну кашу. Потым кум разбіваў тую міску аб падлогу. Рабілі гэтак таму, каб за нованароджаную дзяўчынку пасля біліся хлопцы, а калі хрышчаны быў хлопчык, каб за яго біліся дзяўчаты.

Грошы, атрыманыя за кашу, клалі пад галоўку дзіцяці, каб у будучыні было яно багатае ды нічога яму не бракавала.

Оля ШЫМАНЮК,
V кл. ПШ у Дубічах-Царкоўных

Кася Бялькевіч і Міхась Макарэвіч з беларускага прадшколля ў Беластоку.
Фота Ганны КАНДРАЦЮК

* * *

ты... я... мы...
шукаем
свайго месца
на зямлі,
куточка,
дзе можна
жыць,
марыць,
смяяцца...
а жыццё плыве...
і паміраем
непатрэбныя нікому
у чужым кутку
між чужымі
людзьмі...

Наталля СЕМЯНЮК-МАРАЎСКАЯ,
ПШ у Дубічах-Царкоўных

Жыццё

Жыццё
Як доўгі сон
Жыццё
Як вуж
Крутое
У паваротах.
І ўсё мінае
Канчаецца
Адыходзім
У вечнасць.

Ганна ГЕРМАН,
VI кл. ПШ у Дубічах-Царкоўных

Вясна

Прыйшла вясна
Цудоўная пара
Птушкі спяваюць
Вясну абвяшчаюць
Прыйшла вясна са святамі
Прынесла крашанкі дзіцяткам
І пухнатых жоўтых куранятак

Каміля КАРОЛЬКА,
ПШ у Дубічах-Царкоўных

Польска-беларуская крыжаванка № 19

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) дашліце ў „Зорку” на працягу трох тыдняў. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 15: Анёл, вясна, Нарва, хор, Ася, капрал. Вянок, Сара, жанр, навар, аса, Юля, ял.

Узнагароды, **беларускія кніжкі**, выйгралі: **Каміля Федарук**, **Ілона Асіпюк**, **Раман Лушчынскі** і **Паліна Рубашэўская** з Бельска-Падляшскага, **Марта Стэфанюк** з Нарвы. Віншуем!

Мурашка Параска

(І частка)

Мурашак у мурашніку... Ну, колькі іх там? Як думаеце? Сотні, тысячы, мільёны? Многа-многа! А кожная з іх ведае, дзе яе месца. Выклёўваецца, як кожнае насякомае, і адразу ведае, што рабіць. Ці яна матка-каралева, ці работніца, ці кладаўшчыца, ці стражніца-ваярка. А мо ў іх і мурашыная школа ёсць там, не ведаю, там, дзе маленькія мурашачкі вучацца, як жыць у гэткім аграмадным доме, а можа нават і дзяржаве, бо ў якім доме столькі народу жыве! Пэўна, і цэнтр прыбірання ў мурашніку патрэбны, бо, пэўна, смецце іх засыпала б, як, скажам, Нью-Йорк за час уікэнду. А, можа, і не — кожная мурашка дбае пра чысціню, і тых прыбіральшчыц не трэба? І кожная жыхарка таго мегаполіса, як я ўжо сказала, ведае, чым ёй заняцца, куды спяшаць, якая мэта яе існавання ў гэтым арганізме. І імя ў кожнае ёсць сваё, па ім яе сёстры распазнаюць. Гэта як знак, які вынікае з генетычнага коду і прыдатнасці ў грамадстве.

А мурашка Параска не ведае, што ёй рабіць. Мо ў час, калі ў яечку і лічынцы развівалася, штосьці здарылася з тым яе кодам? І вырасла Параска, і не ведае, куды дзецца. Пабегла пытацца, а кожная дарослая сястрыца занята сваёю справай. Матка толькі яечка зносіць, бабулі памаленьку свае пенсійныя заняткі адрабляюць. З яечкам ці лічынкай не паразмаўляеш. Куды ні ткнецца Параска, усюды перасякаюць ёй дарогу працоўныя мітуслівыя шляхі. Спрабавала далучыцца да мурашак, што валаклі ў кладоўку мёртвага матыля, дык ім толькі перашкодзіла — яны так спраўна перабіралі лапкамі, падымалі аграмадзіну на сваіх спінах! Прыпадняла сваім ахвотным плечуком Параска таго матыля, дык здабыча зусім звалілася. Злякалася Параска, што мурашкі на яе пагневаюцца, ды тыя толькі страпянуліся, ухнулі, падчапілі матыля і зноў спраўна панеслі яго ў мурашніковы лабірынты.

Параска рушыла наперад, праз лес. Праз лес травы, кустоў, дрэў... Трава тая для яе як для нас аграмадныя дрэвы — уяўляеце сабе, як можа быць страшна ёй, малюсенькай мурашцы? Напэўна страшней, чым нам у новай школе! А Параска, натэпаўшыся па лесе, полі, абочыне асфальтавай дарогі, трапіла якраз у школу. Пачаў пакрапваць дождык. Параска палезла па сухой шчыліне ў муры, перабегла падваконнік і прытаілася ў цяпле кухні вясковае школы. Яна, вядома, не ведала, куды трапіла. Але з прыемнасцю пачаставалася крышталікамі цукру, якія хтосьці тут рассыпаў. Ужо задрамала, падклаўшы лапкі пад галаву, як пачула страшны лямант мух: „Бз-з-з, жыць нам не даюць, у-у-у!” Гэта вялікая кухарка, баба Зося, размахваючы аэразолем, пыліла ім па ўсім памяшканні. Словам, праганяла мух са школьнае кухні, палохаючы іх смяротнай атрутай. Параска пабегла за акно, прытаілася ў цёплай шчыліне...

(працяг будзе)

Міра ЛУКША

Полька-„Бульба" ў выкананні дзетак з прадшколля.

„Жабкі" з Гарадка.

Дзіцячыя сустрэчы ў Гарадку

Дзень, калі ў Гарадку ладзілі Дзіцячыя сустрэчы, выпаў халодны і суровы. Але вясна не адступала. Яе прыкметы назіралі мы гледзячы ў вокны аўтобуса, які з Беластока вёз нас на гарадоцкае свята. Квітнеючыя сады на ўскраінах горада, зялёныя лугі і адроджаны лес з морам кураслепу.

Вось, дзеля аднаго падарожжа варта было завітаць у Гарадок. А там — чакала нас яшчэ многа атракцыёнаў!

Быў канец месяца, пятніца, 27 красавіка 2001 года.

Вясна на сцэне

У сярэдзіне Гарадоцкага дома культуры панаваў веснавы настрой. Клімат замацоўвала афармленне сцэны. Над ёй красаваўся казачны лес, намаляваны свежымі майскімі фарбамі. Сцэнічнае афармленне для Дзіцячых сустрэч падрыхтавала гарадоцкая мастачка Марыя Мялешка. Таксама сярод дзіцячай публікі адчувалася вясну. Весялосць, нейкую бадзёрасць, радасць. Дзіцячы смех, размовы, жарты. Гэтае шчабятанне таксама нагадвала птушыны канцэрт веснавога лесу. Сугучнасць публікі з вобразам сцэны была небывалая.

Танцы ў выкананні беластоцкіх дашкольнікаў.

І таму яшчэ — бо ў Гарадку сустрэліся мясцовыя школьнікі з сябрамі з Нарвы і Беластока.

Нарва — Гарадок

Гэта было свята наймалодшых: дашкольнікаў і вучняў пачатковых класаў I-III.

— Добра, калі дзеці з далёкіх мясцін сустракаюцца, — кажа настаўніца беларускай мовы ў Нарве, Ніна Абрамюк. — Для наймалодшых гэта вялікая прыгода і радасць. Пасля такой сустрэчы дзеці хочуць хадзіць на беларускую мову.

Супрацоўніцтва паміж школамі ў Гарадку і Нарве мае ўжо шматгадовую традыцыю.

— Нас чакае яшчэ адна сустрэча старэйшых класаў у Гарадку, а пасля яны прыязджаюць да нас, — дадае Ніна Абрамюк.

У Нарве беларускія элементы — вершы, лічылкі, гульні — уводзяцца ўжо ў нулявым класе. У Гарадку пакуль што ўсё навучанне ідзе на польскай мове. Беларуская мова пачынаецца ў другім класе.

Беласток па-беларуску

Дзеці з беларускага прадшколля ўжо другі раз выступалі на сцэне Гарадоцкага дома культуры. Тры гады таму паказалі тут этнаграфічна-музычную пастаноўку „Юр'еўскі карагод". Зараз прыехалі са слоўна-музычна-танцавальным мантажом.

Беластоцкія дашкольнікі падабаліся гарадоцка-нарваўскім сябрам. Іх песні пра сабаку Чапу, пра мілую матулю, пра вясну запрошаныя дзеці слухалі з адкрытымі роцікамі. Многа захаплення выклікалі беларускія танцы. І беларускія ўборы, у якіх выступілі дзеткі.

Беластоцкія дзеці даволі натуральна паказаліся ў беларускай пастаноўцы. Папраўдзе, яны ўвесь час выступаюць толькі на роднай мове.

Як „Журавінкі"

Дзеці з Гарадка паказалі сцэнку пра бусла і жабак. Пабачыўшы сваіх беларускамоўных аднагодкаў, яны паабяцалі падрыхтаваць у наступным годзе таксама такую пастаноўку. Аднак і тут не забракавала беларускіх элементаў. Прыгожа, быццам другія „Журавінкі", спявалі дзяўчаты з чацвёртага класа.

— Яны ўміг развучылі беларускія песні, — адзначыла настаўніца Тамара Бялькевіч.

Дзяўчаты выступілі з дзіцяча-маладзёжным рэпертуарам. Вакальныя магчымасці і свабоднае адчуванне на сцэне — гэта іх козыр. Варта падумаць пра школьны беларускі калектыў.

Дзіцячыя сустрэчы спансараваў Цэнтр грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь. Іх арганізатары — Тамара Бялькевіч і настаўнікі школы ў Гарадку. **ЗОРКА**

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Перад выступленнем — дашкольнікі з Гарадка.

Гарадоцкія спявачкі пасля выступлення.

У дапамогу настаўніку

Канспект урока для чацвёртага класа

Аўтарка канспекта вядзе ўрок на тэму пор года ў ПШ у Нарве.

Тэма: Прыгажосць пор года.

Мэта ўрока: вучань разумее прачытаны тэкст, рэдагуе правільныя адказы на пытанні, спраўна карыстаецца слоўнікам, чытае з адпаведнай інтанацыяй, піша з памяці і са слыху, бачыць прыгажосць краявіду ў порах года, разумее, чаму трэба ахоўваць, берагчы прыроду, патрапіць унікнуць у атмасферу свят.

Абсталяванне: выстаўка-альбомы: „У веснавыя дні"; „Свята Каляд"; кошык з дарамі восені: грыбы, садавіна, агародніна; жытнёвыя каласкі; галінкі дрэў (з зялёнымі лісточкамі, пупышкамі, асыпаныя снегам, з каляровымі лістамі, кветкі ружы; зборнікі вершаў В. Шведа, слоўнікі — „Слоўнік сінонімаў у беларускай мове", „Слоўнік польска-беларускі", „Слоўнік беларуска-польскі", ілюстрацыі, ліставое дрэва ў збане, адзенне Вясны, Лета, Восені, Зімы, картачкі з заданнямі, радыёпрыёмнік.

Форма заняткаў: адкрыты ўрок для бацькоў і настаўнікаў.

Форма працы: праца калектыўная, індывідуальная, праца ў групах.

У класе раз у тыдзень працуюць сталыя групы.

Метады працы: слоўная — гутарка, аглядная — паказ, практычныя заняткі, элементы драмы, дыдактычныя гульні.

Ход заняткаў

1. Арганізацыйны момант.
2. Уступная гутарка.

а) прэзентацыя кляновых лістоў у збане

— адказы вучняў па пытаннях настаўніка

Настаўнік: Чым адрозніваюцца лісты? *(размерам, колерам)*

б) загадка ў „лістах".

Н.: Ідзіце ад найбольшага да найменшага ліста і прачытайце разгадку — тэму сённяшняга дня. Што атрымалася? *(Поры года)*.

3. Аналіз верша В. Шведа „Поры года".

а) вучні ўважліва слухаюць верш з магнітафоннай стужкі.

Н.: Пра што распавядае В. Швед у вершы?

В.: Пра поры года.

б) самастойна чытаюць верш.

— вышукоўваюць незразумелыя словы, паясняюць іх, карыстаючыся слоўнікамі.

в) адказы вучняў на пытанні настаўніка.

— кароценькая інфармацыя пра паэта (праверка хатняй працы).

Н.: Якія поры года названы ў вершы? Знайдзіце словы, словазлучэнні, якія гавораць пра вясну, лета, восень, зіму. Які колер звязаны з вышэйзгаданымі порамі?

г) На дошцы запісваецца тэма ўрока.

4. У чым заключаецца іх прывабнасць? Што яны з сабой прыносяць? *(вучні разглядаюць выстаўку, дапасоўваюць рэквізіты да пор года, напр.: жытнёвы каласок, кветкі ружы — да лета; альбом „Свята Каляд", белыя галінкі, як быццам асыпаны снегам — да зімы...)*

5. Запісваюцца словы, словазлучэнні *(на дошцы)*.

Восень — цвіце верас, час грыбнікоў, каляровае лісце.

Зіма — мароз, Свята Каляд, зімнія канікулы.

Вясна — цёпла, ажывае прырода, Вялікдзень.

Лета — канікулы, пахне суніцамі і ягадамі, многа кветак.

(вучні астаўляюць свабоднае месца пры кожнай пары года: у далейшым ходзе заняткаў будуць папаўняць працу).

6. Фізкульмінутка.

7. Праца ў групах *(працай кіруе лідэр)*. *Заданні на картачках.*

Заданне I групы

Падабраць словы, якія характарызуюць пэўную пару года:

Лета —

Восень —

Словы для выкарыстання: халодная, сухое, гарачае, дажджлівая, ранняя, марозная, залатая, позняя, цёплае, шчодрая, доўгачаканая, зацяжная.

Заданне II групы

Прачытайце. Падкрэсліце выразы, якія апісваюць вясну, зіму.

Зелянее траўка, аблятае лісце, прыгравае сонейка, знікае снег, карацее дзень, адлятаюць птушкі, замярзаюць рэчкі, расцвітаюць падснежнікі, распускаюцца пупышкі, бягуць ручайкі, кружыць мяцеліца, гняздуюцца птушкі, сохнуць травы, кусціцца жыта, цвітуць ліпы.

Заданне III групы

а) Замяніце словазлучэнні адным словам: снежная бура — (мяцеліца, завея); моцны дождж — (лівень).

б) Размяжуйце па групах сінонімы: пячэ, пахмурны, завіруха, мяцеліца, плённы, грэе, завея.

Заданне IV групы

Дабярыце месяцы да кожнай пары года (*рассыпаныя назвы месяцаў і пор года*).

8. Аналізуюцца заданні чатырох груп — звяртаю ўвагу на правільнае вымаўленне і стараннае пісьмо. Вучні дапаўняюць працу (заданне н-р 5).

9. Замацаванне ведаў, уменняў, навыкаў.

а) на дошцы развешаны малюнкі.

Н.: Разгледзьце малюнкі. Прыдумайце загалоўкі да іх.

В.: Напрыклад: Вясна ў разгары. Летні адпачынак. Гульні на снезе. У грыбах. Велікодны стол... *(кожны вучань прыдумвае прынамсці адзін подпіс)*.

Н.: Якія поры года бачыце на малюнках? Што характэрнае кожнай пары года? У чым праяўляецца іх прыгажосць? *(дзень нараджэння)*. Чаму можна назваць зямлю казачнай? *(заўважае вучань)*.

10. Сустрэча з ПОРАМІ ГОДА

У клас уваходзяць дзеці, апранутыя ў касцюмы Вясны, Зімы, Лета, Восені. Вітаюцца: „Добры дзень дзяўчынкі-весялінкі і хлопчыкі-малайчынкі". *(Вядуць гутарку са школьнікамі)*.

Зіма: Адгадайце загадку з роднае хаткі.

Марозная, калючая,
Снежная, скрыпучая,
Прыйшла да нас сама
Халодная ... *(Дзеці адказваюць: зіма)*.

Н.: Малайцы, з першай перашкодай справіліся.

Восень:

Мы з сябрамі пагуляем
Прыказак пра восень наскладаем.
(Дзеці ўспамінаюць прыказкі).
Напр.: Ганна — асенняя панна.
Прачыста — высявай да чыста.
Пакровы — зарыкалі каровы.

Н.: Вясна — красна, што ты нам прынесла?

Вясна: Словы — рассыпаначкі *(у руцэ трымае картачкі з запісанымі словамі: асяроддзе, Беражы! навакольнае)*.

Будзьце ўважлівы, упарадкуйце словы *(вучні ўголас чытаюць словы, складаюць сказ-лозунг, перакладаюць на польскую мову, паясняюць прачытанае)*. Беражы навакольнае асяроддзе! — лозунг запісваюць у сшытак.

Н.: Добра працавалі галоўкамі.

Лета: Зараз пойдзем далей і заспяваем весялей пра лецейка *(песня гучыць на польскай мове „Lato, lato..." першая страфа)*.

Зіма: А зімачку якой песняй парадуеце. Без песні — хоць трэсні. *(Гучыць „Ціхая ноч")*.

ПОРЫ ГОДА:

Вось і сустрэчы канец.
Хто працаваў — той маладзец.

11. Хатняя праца:

а) „Мая любімая пара года" — зрабіць малюнак (для ўсіх вучняў).

б) Вывучыць верш на памяць — для ахвотных.

12. Ацэнка ведаў, уменняў вучняў. *(вучні атрымоўваюць ацэнкі, 5 у дзённік; + у спецыяльны сшытак настаўніка)*.

Н.: Час прыйшоў нам развітацца і падарункамі заняцца.

(Дзеці дораць бацькоў, настаўнікаў вершам, які раней склалі на ўроку, а настаўнік частуе ўсіх прысутных цукеркамі).

Апрацавала Ніна Абрамюк,
настаўніца ПШ у Нарве

Культура Беларусі на кампакт-дыску

Мультымедыйныя выданні культурнага зместу, што сумяшчаюць у сабе ўласцівасці кніг і відэафільмаў, займаюць адно з найважнейшых месцаў у агульным аб'ёме мультымедыяльнай прадукцыі, бо з'яўляюцца найбольш эфектыўным сёння відам вучэбна-пазнавальнага дапаможніка.

На жаль, выданні такога кшталту, прысвечаныя беларускай культуры, дагэтуль адсутнічалі.

Грамадская арганізацыя „АртМультыМедыя", створаная з мэтай пашырэння сферы выкарыстання новых тэхналогій у культуры і адукацыі, займаецца распрацоўкай і распаўсюджваннем мультымедыйных выданняў серыі „Культура Беларусі. Лепшыя старонкі" на кампакт-дысках.

Гэтыя выданні прэзентуюць беларускую культуру ў разнастайнасці культур свету і маюць за мэту паспрыяць атрыманню глыбокіх і паўнавартасных ведаў пра культуру Беларусі.

У творчых праектах „АртМультыМедыя" ўдзельнічаюць лепшыя спецыялісты Рэспублікі Беларусь, якія прысвяцілі свае навуковыя доследы розным аспектам культуры і адукацыі (дактары і кандыдаты навук, прафесары, лаўрэаты Дзяржаўных прэмій, мастацтвазнаўцы, лінгвісты, спецыялісты ў галіне мультымедыйных тэхналогій).

Гэтая серыя з'яўляецца першым выданнем такога кшталту ў Беларусі.

На дадзены момант падрыхтаваныя чатыры выпускі серыі:

1. Архітэктура Беларусі: паміж грамадствам і прыродай

19 ілюстраваных нарысаў. Ілюстраваны тэрміналагічны слоўнік. Пошукавая сістэма. Каталог ілюстрацый. Фонавая беларуская музыка.

2. Беларуская іканапісная школа

7 ілюстраваных нарысаў. Ілюстраваны тэрміналагічны слоўнік. Пошукавая сістэма. Каталог ілюстрацый. Фонавая беларуская музыка.

3. Беларускі традыцыйны касцюм

17 ілюстраваных нарысаў. Ілюстраваны тэрміналагічны слоўнік. Пошукавая сістэма. Каталог ілюстрацый. Фонавая беларуская музыка.

4. 100 рарытэтаў з музеяў Беларусі

Каталог ілюстрацый. Фонавая беларуская музыка.

Гэтыя чатыры выпускі складаюць першы кампакт-дыск серыі.

На розных стадыях падрыхтоўкі знаходзяцца выпускі „Мастацкая адукацыя ў Беларусі", „Культура нацыянальнай мовы", „Агульная гісторыя беларускага мастацтва", „Мастацтва Беларусі 17-18 стст.", „Музыка Беларусі 16-18 стст.".

Распрацаваны перспектыўны план выпуску серыі. Усяго ў плане 24 выпускі.

Калі Вы жадаеце набыць кампакт-дыскі серыі „Культура Беларусі. Лепшыя старонкі", калі ласка, звяртайцеся па адрасе: Беларусь, 220013, Мінск-13, а/с 40, тэлефон/факс: (017) 263-14-77, электронны адрас: artmm@user.unibel.by

Беларуская Фінляндыя

Нягледзячы на турыстычны сезон, у Браславе веяла безнадзейнай нудотнасцю. Пустэча і вялы рытм жыцця нагадвалі пра крызіс у краіне. Панавала нейкая нездаровая нецікавасць да ўсяго і ўсіх.

— Яшчэ крыху і пачнем паўтараць рытуальнае „всё нармальна”, — жартавалі мы.

Вакол рынку, і заадно вакол нашай лавачкі, кружыла міліцыйная машына.

— Уявіце, што забіраюць нам пашпарты, — пачаў Вячаслаў.

Яго жарт пасаваў да месца і сітуацыі. У нас не было канкрэтнай прапіскі і... чаплялася беларуская манія праследу. Што ўсё тут з усім спалучанае, заклепанае, мэтанакіраванае, а мы як замежныя госці пад спецыяльным наглядам.

Здаровы інстынкт падказваў нам чым хутчэй развітацца з горадам. З другога боку — вабілі пляж і возера Дрывяты, атракцыёны мясцовай турбазы.

* * *

Доўга кружылі мы па наваколлі, па лясах, у пошуках добрага месца для абозу. У канцы наткнуліся на „афіцыйную” моладзь. Іх месца было пазначана чырвона-зялёным сцягам. Дзяўчаты і хлопцы, апранутыя ў спартыўныя касцюмы, падобныя на міліцыйную форму, варылі вячэру. Ад іх гаршкоў ішоў непрыемны пах, які на вялікую адлегласць значыў лясное паветра.

— Вось табе і экспансія, — дзівавалісь мы, хутка пакідаючы сустрэтую кампанію і той пах.

— Такім пахам можна прагнаць самага лютага ворага!

Нашы далейшыя пошукі апынуліся пад пагрозай. Найбольш хвалявала адсутнасць указальнікаў ці нейкай інфармацыі. Браслаў і наваколле — адзін з буйнейшых турыстычных рэгіёнаў, быццам кпіў з нашай патрабавальнасці. У вочы, як маніякальны прывід, кідаўся манумент — памежны знак калгаса „Зорька”, у форме ўсечанай піраміды.

* * *

У канцы зноў вярнуліся мы ў Браслаў, а дакладней, на пляж, што акаляе Замкаву гару і частку горада. Возера Дрывяты, як сапраўднае мора, сцелецца па небакрай. Яго памеры — 10 кіламетраў даўжыні, 4 шырыні, агульная плошча 36 100 гектараў. На возеры шэсць невялікіх астравоў. Усе браслаўскія азёры, якіх у раёне за трыста, займаюць плошчу 130 квадратных км. Пасля Дрывят найбольшыя: Снуды, Струста, Воласа Паўночны, Воласа Паўднёвы. Тутэйшы краявід сапраўды нагадвае Фінляндыю. Азёры распалажаны сярод узгорыстага рэльефу з разнастайнымі формамі водна-ледавіковай нагрузкі — камамі, озамі. Большасць з іх звязана невялічкімі рэчкамі, канавамі і пратокамі. У азёрах захаваліся рэдкія і старажытныя віды жывёл: лімнакалянус, понтапарэя, бакаплаў Паласа, мізіда рэліктавая; сярод раслін: гарлачык жоўты малы, гідрыла кальчаковая, занесеныя ў Чырвоную кнігу Беларусі.

* * *

Прырода Браслаўшчыны ахоўваецца дзяржавай і ў будучыні мае шанц стаць экалагічным атракцыёнам Еўропы. Нацыянальны парк „Браслаўскія азёры”, які ўзнік у 1995 годзе, займае 71,5 тысяч гектараў. Яго паўночная мяжа пачынаецца на Друі і далей, паўз латышскую мяжу цягнецца на 56 км. На поўдні сягае па Богінскае возера. Браслаў і згаданыя возеры разам складаюць цэнтр парку. Гэту азёрна-лясную краіну найлепш аглядаць з самалёта. Большасць прасторы займаюць лясы (46%) і азёры (17%). Лясы згуртаваныя ў два комплексы: Друйская лясная дача на поўначы і Богінска-Бяльмонцкая пушча на поўдні. Тут сустрэнеце рэдкія віды дрэў як сібірская лісцвенніца ці карэльская бяроза. Сярод мясцовай флоры за 500 відаў, таксама скандынаўскія віды, як карлікавая бяроза і марошкавая маліна.

Браслаўскі запаведнік — сапраўдны птушыны рай. Паводле назіранняў арнітолагаў, у парку жыве 85% відаў птушак, якія засяляюць усю Беларусь. Палова — выміраючы гатунак: арол белы, беркут, рыбалоў, арлан-белахвост, цецярук, чорны бусел, журавель, глушэц ці белая курапатка.

Лясная, крышталёва-чыстая рачулка ў парку „Браслаўскія азёры”.

* * *

Вечарэла і мы рашылі падацца ў Шаркаўшчыну. Аставацца тут на начлег мы не мелі ні сілы, ні адвагі. Невыносна хацелася сагрэцца атмасферай дому.

— Бульбы, дранікаў, картошкі... — дамагалася ад ранку Цалінка.

Азёрна-лясны, прыдарожны краявід Браслаўшчыны.

Здаровы інстынкт падказаў нам памачыць ногі ў Дрывятах, пасля чаго мы пачулі, як стома і нуда сплывае ў ваду. Прырода Браслаўшчыны мае гаючыя якасці. Асабліва азёры. Быццам рукой здымаюць усякія жахі, выкліканыя шокам кантрастаў або псіхічным прыгнётам.

Сам горад таксама падорыў нам добры ўспамін. Адзіным чалавекам, які размаўляў з намі на беларускай мове быў каменячос. Дзядзька, карыстаючыся крышталёвай беларушчынай, з усёй сілы хацеў дапамагчы.

— Ці не паэт, або мастак быў той каменячос, — гадалі мы, прыводзячы гайнаўскі вопыт.

Ганна Кандрацюк
Фота аўтара

— Калі мая мама іграла ў Тамары Саланевіч, дык я за яе ішла ўпраўляцца, — успамінае з усмешкай Юля Грыка, у той час Даманіха, дачка Веры Лявіцкай, „знахаркі” з „Крэсавай балады”.

Не паддацца суму

У 1972 годзе меляшкоўскія кабеты, сяброўкі з сельгасгуртка, „кулка” сялянскіх гаспадынь, рашылі заснаваць „зэспул”. Народ непаседлівы, вясёлы, кампанейскі. Усе бабы, мо толькі Юрку Даманя дапускалі да сваіх таямніц. І зараз жа сталі выступаць на аглядах беларускіх друмгурткоў. З пастаноўкамі вяселля, вечарынкі. З куфраў павыцягвалі саяны, блузкі, бо ж не толькі будуць вучыцца, як гатаваць „цо монж любі”, гадаваць куранят, пазычаць відэльцы, лыжкі і іншы посуд на імпрэзы ды быць у прынцыпе ды агулам прагрэсіўнымі гаспадынькамі. 21 баба — у той час, калі хопіць адна, каб чорта пераперла!.. Валя Дарашкевіч, Ганна Дарашкевіч, Вера Ярмолік, Ніна і Ірка Лавіцкія, Лёня Шыкуць, Насця Карповіч, Галіна Сянкевіч, Марыся Казёл, Сонька Марцінчык, Ніна і Сафія Пятэльскія, Вера Дарашкевіч... Юля Грыка ледзь ужо ўспомніць можа. Больш ужо адышло, чым жыве ў гэтай калісь актыўнай вёсцы. „Усімі намі кіравала Зіна Літвін. Яна нас яднала, — гэта дык не забываецца спадарыні Юлі. — І я кажу: «А, можа, давайце паставім „Мікітаў лапаць”». — «А хто будзе за Мікіту?» — «А магу і я!»”

Юлінаму сыну Томусю тады было чатыры месяцы. Выступалі, хадзілі на рэпетыцыі. А прыйшлося ехаць у Беласток на агляд — Юля кажа, што не едзе. То ж у другім месяцы была тады Ромкам. Усё ж — паехала. Узялі тады першае месца. Зінін муж сядзеў каля журы. „Гэты мужык дык хіба шалёны! Так нармальны не зайграе!” — меркавалі ў камісіі. — „Дык гэта і не мужык, а баба! — засмяяўся Літвін. — Усе ў нас бабы пераапранутыя! А ў яе чацвёра дзяцей, пятым ходзіць!” А Юля як у трансе іграла сваю ролю, і пад стол залазіла, і яблык кідала: „Хоць яблыкам пачастую Зоську!” У Юлі былі тады Валя, Гэлька, Андрэйка, Тамаш... Доўга іграла ў калектыве, аж як шосты раз зацяжарыла, дык перастала. І ў „Вячорках” выступала, і ў „Вяселлі”, і ў „Судзе”... Пасля, як выехала рабіць у Гарадок, дык ужо часу не мела. „Вось так і перарвалася мая «кар’ера», — смяецца. Хоць ёй тады і нясмешна было. А цяпер вось Раману 28 гадоў, Касьцы — 26... На дзесяцігоддзе, на юбілей, як

Юля Грыка цяпер і ў ролі Мікіты.

ім сельгасгуртковуські прэзас узнагароды даваў за самадзейнасць, дык Юлі, хоць запрошанай, узнагароды (матэрыялу на сукенку) ужо не далі, бо ўжо не была меляшкоўская.

А рабіла ж і ў Меляшках, і ў белявіцкім свінарніку, і ў гарадоцкім „Каро”, і ў беластоцкім „Крысталі” на кухні. Пенсіянерка ўжо сёння, па агульным стане здароўя. Да маленькае Юлі, у чатыры гады, прычапіўся быў туберкулёз касцей — гуляючы, стукнуў ёй у руку на санках семяноўскі хлопчык. Тады іх, Юлю ды Валю з мамай, тата пакінуў, пасля ўзяў адну дачку ў Бельск, да новае сям’і, каб аліментаў не плаціць. Ніяк не гаілася, хоць дактары займаліся, Юліна рука, дык бальсонам (альясам) яе лячыла. Потым пасля першага дзіцяці паўгода ў санаторыі была — увесь кальцый з агранізму ўцёк. Сухоты перайшлі і на вуха. Аперацыяў усіх мела сем. Цяпер — пры другім мужы, Базылю, дбайлівым, сталым, разважлівым. Першы, Юрка, кінуўшы шасцёра дзяцей, закахаўся ў іншую, больш спакойную кабету. Бо як жа могуць жыць разам такія „апараты”, як Юрка Дамань і Юля? Пахавала малога Томуся, дарослую, замардаваную восенню 1999 г. Галенку. Памятае выбухі бомбаў, бабу Вольку з гадзіннікам, і сябе з лялькай, як уцякаюць ад вайны. І ўсміхаецца да ўспамінаў. Хоць не заўсёды чалавеку да смеху. А што яму застаецца?

Міра Лукша
Фота аўтара

У ваенным Беластоку

(працяг; пачатак у 14 н-ры)

Першы пагром гета

Мы, прымусовыя беларускія рабочыя, у беластоцкім гета неяк прыстасаваліся да незвычайных для нас умоў працы. Пазнаёміліся са сваімі „настаўнікамі", прывучыліся працаваць на ткацкіх станках ці ў прадзільні. За намі былі ўжо каталіцкія і праваслаўныя Каляды 1942 года. Сустрэлі Новы 1943 год.

Недзе ад паловы студзеня адчуваўся неспакой сярод яўрэйскіх рабочых. Майстар цэха паставіў мяне ля ткацкага станка, пры якім працаваў старэнькі яўрэй. Побач ткачыхай працавала дзяўчына Фаня. Аднойчы па тэхнічнай прычыне затрымаліся станкі ва ўсім цэху. Мы цешыліся, што будзе нейкі час ціха, без ломату і можна будзе адпачыць. Фаня падышла да зачыненага акна і працерла шыбіну. У цэх заглянула бледнае зімовае сонца. Фаня заўсёды была сумная, малагаварлівая. Мне хацелася сказаць ёй нешта прыемнае, каб яе хоць крыху развесяліць. Падышла я да яе і кажу:

— Глянь, Фаня, якое ўжо сонца. Будзем чакаць вясну, будзе лепш, цяпло, зелена, адчынім запыленае акно.

— Лепш? Каму?

— Усім пакрысе, — кажу.

— Можа вам, нам — не дадуць жыць...

Я не ведала што ёй адказаць і спытала:

— Ці гэта ўжо вядома, ці ты так сама думаеш?

— Ужо Юдэнрат збірае кантрыбуцыю. Некаторыя можа выкупяцца, — адказала.

Пра гэтую размову я сказала сваёй маме. Яна спытала старэйшага, знаёмага ёй яўрэйскага майстра і той пацвердзіў: „Нешта будзе, бо ўжо паліквідавалі ўсе меншыя зборышчы яўрэяў на Беласточчыне і напэўна возьмуцца за беластоцкае". Хадзілі па гета чуткі, што будуць вывозіць непрацаздольных. Майстар сказаў маме:

— У мяне жонка і двое дзяцей. Калі іх будуць вывозіць, я паеду з імі ахвотна.

Канчаўся студзень. Польскі майстар цэха часта падыходзіў да нашага станка і глядзеў ці навучылася я ўжо абслугоўваць кросны. Фаня падміргнула: „Вучыся, хутка ўжо сама будзеш вымушана ўсё рабіць". Мне стала сумна, паколькі я ведала, аб чым яна думала. Ткач, пры якім я мела вучыцца, стары чалавек, амаль не гаварыў са мною. Адказваў, нават ахвотна, але толькі на пытанні.

Зіма была марозная і снежная. Пачаўся люты. Аднойчы па фабрыцы разышлася вестка, што ад наступнага дня не прыходзім на фабрыку. Фаня амаль увесь дзень прастаяла пры акне, быццам дзесьці глядзела, але яе вочы былі мутныя і надта сумныя. Я прабавала нешта гаварыць, пытаць, чаму заўтра не прыходзім на работу.

— Усе ведаюць, з гета будуць вывозіць, — адказала.

— Але куды?

— Кажуць у Люблін або зразу ў Трэблінку.

Пад вечар пра вывазку аж шумела ва ўсіх цэхах. Людзі трэсліся бы ў ліхаманцы. Фаня ўзяла з падваконніка куртку, затрымала свае кросны, глянула на мяне і прамовіла: „Сёння не мусіш старацца, немец не прыйдзе, у іх важнейшыя справы на галаве". І адышла — у вечнасць... Больш я яе не бачыла.

І так 5 лютага 1943 года г.зв. арыйскія рабочыя не з'явіліся на сваіх месцах працы ў беластоцкім гета. А там пачалося пекла.

Немцы назвалі пагром „першай акцыяй". Загінула тады больш за дзесяць тысяч людзей. На месцы было забітых 2 000 яўрэяў, а 10 тысяч вывезлі ў Люблін і, галоўным чынам, у Трэблінку. Акцыя трывала ад 5 да 12 лютага. Не было тады ні тэлефонаў, ні радыё, але весткі пра трагічныя падзеі ў гета разыходзіліся па горадзе маланкава. Нехта паведаміў нам, што ўсё скончылася і трэба ісці на працу.

У палове лютага перад сёмай гадзінай раніцы з'явіліся мы пад фабрычнай брамай. Набліжаючыся да калючай агароджы ад колішняй вуліцы Артылерыйскай, заўважылі мы, што за ёю ляжыць доўгая і шырокая каляровая сцірта, быццам нейкая вопратка, скінутая на кучу. Хтосьці патлумачыў, што, відаць, гэта рэчы з апусцелых яўрэйскіх кватэр. Але няўпэўненасць трывала коратка. Пакуль сталі нас упускаць за браму, ужо мы ведалі — гэта былі трупы памардаваных!

Першага дня не было ніякай працы. Яўрэйскіх рабочых не было. Майстар загадаў пачысціць станкі. Назаўтра мелі вярнуцца некаторыя ткачы. Праз некалькі дзён вярнулася іх менш чым палавіна. Некаторыя з яўрэяў напаміналі васковыя фігуры — жоўтыя, з блудным зрокам людзі маўчалі і не глядзелі ў наш бок. Мы іх разумелі. Іншыя лаялі немцаў, расказвалі, што дзеялася. Казалі, што яны не здадуцца без бою. Я тады ўпершыню пачула пра іхняга важака Тэненбаўма, у размовах часта паўтаралася прозвішча Бараш. Не вярнулася пасля ўспомненай „акцыі" больш чым палавіна ткачоў. Не вярнуліся і мой ткач, і Фаня, і дзве надзвычай прыгожыя яўрэйскія дзяўчыны, якія выплачвалі нам зарплату. Сталася так, як прадказала Фаня: дачакалася я вясны без яе.

Перажыванні ў беластоцкім гета пакінулі пякучы след у маёй псіхіцы на ўсё жыццё. Нават цяпер, калі пішу аб гэтым, амаль пасля кожнага сказа раблю перапынак, заплюшчваю вочы, заглядаю дзесьці ў сваё нутро і тады адкрываюцца ў мазгах клеткі памяці. Бачу, здаецца, усё так, як гэта тады бачыла, хаця з тае пары прайшло ўжо больш паўстагоддзя.

Пасля пагрому немцы зрабілі ў фабрыцы нейкую перагрупоўку. Відаць, майстры цэхаў падбіралі сабе адпаведных рабочых. Многія з нашых людзей былі накіраваны на іншую працу. Пад дваццаць асоб, у тым ліку і мяне, перавялі ў тэкстыльную фабрыку па вул. Варшаўскай 3 „а". Там працавала я ў прадзільным цэху.

У жніўні 1943 года пачалася другая „акцыя" — канчатковая ліквідацыя беластоцкіх яўрэяў. Некалькі тыдняў гарэлі вуліцы беластоцкага гета, грымелі выстралы, узрываліся бомбы. У гэтым пекле загінула каля 30 тысяч жыхароў Беластока, продкі якіх жылі тут дзесяткі а мо і сотні гадоў. Загінулі яны толькі таму, што былі іншай, чамусьці ненавіднай фашыстам, нацыі.

Намаганні з боку арыйскіх барацьбітоў дапамагчы яўрэйскім паўстанцам не мелі большага значэння — хіба што маральную падтрымку. У нашай фабрыцы па вуліцы Варшаўскай адбыўся таксама спектакль фашыстоўскага тэрору. У жніўні, сярод дня, майстры з немцамі затрымалі станкі, прайшлі па цэхах і загадалі ўсім выйсці на панадворак. Мы не ведалі, што дзеецца. Ужо на лесвіцы майстар сказаў мне і дзвюм дзяўчынам: „Вы не ідзіце, гэта не для вас". Мы асталіся і, на шчасце, не бачылі трагедыі, калі каралі злоўленых партызан. „Чаму тут? — здзіўляліся рабочыя. — Якія тут партызаны?" За хвіліну ўсё стала ясным.

Экзекуцыя адбылася ў нямецкім парадку: жандары вывелі з фабрычнага склада трох рабочых у наручніках. Немец штосьці адчытаў з паперкі. Большасць сабраных гледачоў зразумела толькі адно слова — „бандітэн". Падышло некалькі немцаў, закінулі ім петлі на шыі, загадалі стаць на скрынкі — такое падвышэнне пад шыбеніцай — выбілі нагамі тыя скрынкі і ўжо было па ўсім відовішчы. Адзін з павешаных паходзіў з Белавежы. Здаецца, называўся Краеўскі. Да вайны працаваў школьным сторажам.

Неўзабаве пасля гэтага трагічнага здарэння мая праца ў фабрыцы закончылася. Я захварэла туберкулёзам. Лячыў мяне цудоўны чалавек — уважлівы, сардэчны доктар Ганкевіч. Імя яго я ўжо забыла. Быў ён праваслаўны і не раз мы бачыліся ў царкве.

Ужо ў Варшаве сустрэлася я і пазнаёмілася з ягонай дачкою. Доктар ужо не жыў. Знаёмства наша трывала амаль два гады (ад 1956 да 1958 года). Пасля Люба недзе выехала і я больш пра яе не чула. Перажывала яна нейкія свае асабістыя драмы. Яе знікненне асталося для мяне загадкай. Дзіўна, але так было.

(працяг будзе)

Алена АНІШЭЎСКАЯ

Хачу быць вясёлай аптымісткай

Расказвае 67-гадовая Марыя ЛЯЎЧУК — жыхарка Ставішчаў Чаромхаўскай гміны.



— Бацька наш, Міхал Рошчанка, працаваў на чыгунцы. У 1943 годзе быў вывезены на прымусовыя работы ў Нямеччыну. Засталася маці і шасцёра дзетак. У жыцці па-рознаму бывала: спазналі смак голаду ды пацярпелі ад холаду. Многае я запамятала з таго часу, але гэтае здарэнне, як немец мяне ў калодзежы ўтапіць хацеў, ніколі не забуду. А было гэта так. Маці замясіла цеста ў дзежцы ды нанач пакінула, каб ранкам хлеб спячы. Калі пад камінам агонь запаліла, дык да Тэрэшчукоў за бляшкамі выйшла, бо сваіх не мела. З панадворка ўбачыла пад'язджаючы чорны лімузін, на якім гестапа ездзіла. Прадбачваючы бяду, ад перапуду на загуменне ўцякла ды паміж стадоламі схавалася. Прыкмецілі яе немцы.

Аўтамабіль спыніўся, у хату зайшло двух рослых немцаў у чорных плашчах. Адзін з іх запытаў на польскай мове:

— Gdzie wasza matka?

— Nie wiemy gdzie poszła, — адказаў Сяргей, старэйшы брат.

— Ja ci przypomnę, — прасіпеў незнаёмы і ўрэзаў Сяргею ў твар. — Macie natychmiast poszukać i powiedzieć, ażeby przyszła do domu!..

Мы з братам пайшлі шукаць маці, а немцы засталіся на панадворку. Неўзабаве вярнуліся адны. Маці не знайшлі. З-за вёскі ішла цётка Марыя Саснюк з ламаччам на плячах. Немцы прыкмецілі яе. Калі жанчына накіравалася на панадворак, яны рушылі за ёю. Неўзабаве справа высвятлілася. Некалькі дзён раней гэтыя ж гестапаўцы сустрэлі цётку Марыю ў лесе. Назваўшы сябе партызанамі, папрасілі жанчыну паказаць дарогу ў Вульку-Тэрахоўскую. Тая не толькі дарогу паказала, але і лусту хлеба ім дала. „Партызаны" ад'ехалі і зараз вярнуліся арыштаваць жанчыну, палічыўшы яе ворагам. Убачыўшы ўцякаючую маці, падумалі, што гэта Марыя Саснюк, бо абедзве жанчыны рослыя былі і падобныя. Але калі немцы ад'ехалі з цёткай Марыяй, маці вярнулася дахаты.

Паслала яна мяне за бляшкамі да цёткі Марысі Рошчанкі. У іх кватараваўся нямецкі афіцэр. Каля дома кругласутачна трымаў варту салдат. Калі не стаў мяне прапускаць у дом, я паспрабавала шмыргнуць у яго пад рукамі. Злавіў ён мяне, узяў пад руку, як сноп саломы і накіраваўся да калодзежа. Не ведаю, што думаў вартаўнік — утапіць у калодзежы ці перапужаць, але я пачала страшна крычаць. З хаты выйшаў афіцэр з намыленай барадою (відаць, брыўся). Загадаў вартаўніку адпусціць мяне і вылаяў салдата ды пабіў яго. Мяне забраў з сабою ў дом. Вярнулася я дамоў з бляшкамі і расказала маці пра здарэнне. Матуля моцна хвалявалася. Пасля солтыс загадаў пакінуць нам сваю хату, а самім перасяліцца да Марысі Саснюк. Наш дом быў самы вялікі ў вёсцы. Немцы прызначылі яго на кватэру для войска. Прыспасобілі нары для спання. Мы гнездзіліся ў двух невялічкіх памяшканнях — разам пятнаццаць душ. Пасля месяца солтыс перавёў нас у апусцелую кватэру па Марку-Катанцы, як яго аднавяскоўцы клікалі. Матуля пачала хадайнічаць, каб бацьку з Нямеччыны вярнуць. Дамовілася з чалавекам з-за лініі Керзана, што ён заменіць бацьку на рабоце. Неўзабаве вярнуўся ён дамоў. Паступіў на чыгунку на даўнейшую работу. Жыццё пакацілася сваім шляхам.

У 1954 годзе выйшла я замуж за Янку Саснюка. Не пашанцавала ў жыцці. Шэсць гадоў пазней выехала ў Беласток. Пачала працаваць кандуктарам у ПКСе. Павышалі мяне на рабоце. Перад адыходам на пенсію даслужылася я пасады інструктара па білетных касах. У 1990 годзе атрымала пенсію. Вярнулася ў Ставішчы. Апекавалася хворай маці (бацька памёр у 1975 годзе). У 1995 г. і яна мяне пакінула. Застаюся адна са сваімі думкамі. У вольны час пішу вершы. Праўда, патрабуюць яны акуратнай апрацоўкі, але, спадзяюся, што змест іх кране не адну добразычлівую душу. Думаю аб будучыні. Намагаюся быць вясёлай аптымісткай.

Уладзімір СІДАРУК

Бельскі Першамай

1 мая — міжнароднае свята рабочых, якое асабліва грандыёзна адзначалася пры камуністах, прайшло не без водгуку і ў Бельску-Падляшскім. Амаль ва ўсіх месцах горада расклеены былі плакаты з запрашэннем да святкаванняў.

Грамадскі першамайскі камітэт у Бельску-Падляшскім (амаль ніхто з апытаных мною жыхароў горада не ведаў, што існуе такая арганізацыя) шчыра запрашаў на супольныя гулянні.

Ад 12 гадзіны да 13^{40} каля гарадскога парку праводзіліся спартыўныя спаборніцтвы, у якіх удзельнічалі дзеці з бельскіх школ. Пасля галоўнай вуліцай горада, Міцкевіча, ад гарадской Ратушы да амфітэатра (на Плянтах), прайшло надта сціплае першамайскае шэсце. Як заўсёды, афіцыйная частка не прыцягнула большай увагі сабраных на Плянтах бяльшчан, якія прыйшлі паслухаць канцэрт гуртоў (працягваўся ён ад 14^{30} да 18^{30}).

На бельскай сцэне выступілі „Дзявочыя ноткі", „Васілёчкі", „Чарамшына", „Ранок", „Журавінка", „Лідэр", „Jaladreips", „Dziurawy Wigwam" і „Studium Piosenki".

Першамайскае святкаванне не прыцягнула натоўпаў бяльшчан. Большасць удзельнікаў святкаванняў складалі маладыя людзі, якія не мелі ў гэты дзень заняткаў, і пенсіянеры — найбольшыя патрыёты, якім заўсёды чагосьці бракуе ў жыцці: то здароўя, то грошай.

Большасць жыхароў Бельска адзначыла Першамай працай. Свабодны ад работы дзень людзі праводзілі на вёсках або на ўчастках. Прыгожая пагода спрыяла працы ў полі. 1 мая бяльшчане закладалі агароды, садзілі бульбу. Працавітым быў вольны ад работы дзень.

Паўліна Шафран

Бяда з бядою

Сёлета Бельскаму павятоваму цэнтру дапамогі сям'і спатрэбілася б 653 810 зл. Але ў павятовым бюджэце запланавалі ім амаль удвая меншую датацыю ў памерах 363 800 зл. Яна таксама ніжэйшая за мінулагоднюю на 20%.

З гэтых грошай выдзяляюцца дапамогі для дзяцей у заменных сем'х. З уласных сродкаў павятовыя ўлады выдзелілі 20 800 зл. на рэчавую дапамогу для дзяцей, якія набываюць самастойнасць.

З-за скромнай датацыі пад канец года ўпаўнаважаныя да атрымання дапамогі могуць не атрымаць грошай. Павятовым уладам цяжка пагасіць фінансавыя патрэбы ў гэтай дзялянцы сваімі сродкамі. Напрыклад, на інвестыцыйныя выдаткі павятовыя ўлады перадалі цэнтру дапамогі сям'і 109 160 зл., што складае 59% гадавога фінансавага плана ў гэтай дзялянцы. А грошы на гэтыя мэты павінны былі быць выдзелены з дзяржбюджэту.

Два гады таму, калі стваралися паветы, было шмат абяцанняў. Але, як паказала жыццё, абавязак фінансавання задач дзяржаўнай адміністрацыяй тая спіхвае на павятовыя структуры.

Міхал Мінцэвіч

Смерць перад адлётам у вырай

У вёсцы Пасечнікі-Вялікія, непадалёк трансфарматара з паметкай Затрасцінец восенню ляжалі два маладыя нежывыя буслы. Не дадзена ім было адляцець у вырай, бо тут спасцігла іх таямнічая смерць.

А ўсяму вінавата нядаўна перабудаваная электраэнергетычная лінія высокага напружання. Устаноўка, бяспечная для разумных людзей, аказалася смяротнай пасткай для птушак. Ужо звычайнаму спажыўцу электраэнергіі відаць, што на трансфарматары і суседнім стаўбе тырчаць блізка сябе неізаляваныя правады. Буслы — птушкі вялікія — прызямляючыся, сядаюць не на адзін провад, а на два. Сам трансфарматар — гэта павуцінне правадоў пад высокім напружаннем. Энергетыкам не хапіла ўляўлення: дастаткова было пракласці ізаляваныя правады і птушкі былі б бяспечнымі. Ці паўторыцца бусліная трагедыя і ў гэтым годзе?

Уладзіслаў Завадскі

Фота аўтара

Небяспечныя правады (пазначаныя стрэлкамі) каля Пасечнік-Вялікіх.

Філатэлістычная выстаўка

28 красавіка г.г. у Чаромхаўскім ГОКу адкрылася філатэлістычная выстаўка „Захоўвайма прыроду". Ініцыятарам (і арганізатарам) мерапрыемства з'яўляецца настаўніца Надзея Суліма, апякун школьнага філатэлістычнага гуртка.

На вернісажы прысутнічалі прадстаўнікі Акруговага аддзела Філатэлістычнага саюза, на чале з яго старшынёю Аляксандрам Стапанчанкам, войт гміны і дырэктар школы, школьная моладзь і кола зацікаўленых жыхароў пасёлка. На выстаўцы прэзентаваліся калекцыі марак чаромхаўскіх філатэлістаў: Агнешкі і Бажэны Раманюк, Тамаша і Катажыны Тарасюк, Марціна Купрыцюка, Дыяны Мішчук, Дароты Дарашкевіч і Аніты Шатыловіч. Усяго дваццаць чатыры стэнды. Працаўнікі мясцовай пошты прадавалі паштовыя карткі, маркі і паштоўкі з краявідамі.

Атракцыёнам вернісажа стаў паштовы штамп, прымеркаваны да выставы з выявай дубовага ліста і жалудоў, і канверт з зубром і надпісам: „Wystawa Filatelistyczna Chrońmy przyrodę — powiat hajnowski — Czeremcha 2001". Такіх канвертаў надрукавана сто штук і з'яўляюцца яны сапраўдным рарытэтам. Карту-максімум (бо так яе называюць філатэлісты), як і штамп, праектаваў Анджэй Тшцінскі з Беластока.

— Асноўнай справай у карце-максімум, — гаварыў мастак — з'яўляецца спалучэнне ў адну цэласць трох элементаў: ілюстрацыі, маркі і паштовага штампа. Зубр, дубовы ліст і жалуды — кампазіцыя ў сам раз для тэмы. Выстаўка прысвечана дзвюм тэмам. Першая датычыць аховы прыроды, другая — чыгуначнага транспарту. Як сказала спадарыня Суліма, чыгуначны транспарт з'яўляецца найбольш экалагічным і таму адведзена яму месца на выстаўцы.

Чаромхаўскае мерапрыемства набудзе вядомасць сярод філатэлістаў. Канверты і паштовыя карты з чаромхаўскім штампам пойдуць па ўсім свеце. Падзея будзе запісана ў філатэлістычныя каталогі. Трэба адзначыць, што гэта асноўная заслуга арганізатара — Надзеі Сулімы. Яна хадайнічала ў прадпрыемстве Галоўнай пошты за адпаведным акалічнасці штампам, як і за фінансавыя сродкі на неабходныя выдаткі. Арганізатары дзякуюць Гайнаўскаму старастве, дырэктару Насычальні ў Чаромсе, Чыгуначнаму прадпрыемству таварных перавозаў як і прафсаюзнай арганізацыі машыністаў. Каб не яны, чаромхаўскай выстаўцы не ўбачыць дзённага святла.

Уладзімір Сідарук

Са смеццем у Еўрасаюз

19 красавіка г.г. давялося мне ехаць аўтобусам ПКС з Беластока ў Гайнаўку. Сеў я на першым сядзенні, каб добра было відаць, што дзеецца на шашы. Мінуўшы Заблудаў, аўтобус пад'ехаў пад горку ва ўрочышчы Краснае і калі пачаў апускацца ўніз, я ўбачыў кучы смецця і пластмасавыя бутэлькі на абочынах лясной дарогі. Нават каля вёскі Ахрэмавічы пры дарожцы, якая з шашы вядзе ў лес, таксама ляжыць шмат бутэлек.

У засмечванні лесу ў многім вінаваты жыхары гарадоў, якія прыязджаюць сюды па ягады і грыбы. Неўзабаве настане летні сезон і зноў будуць паяўляцца новыя кучы смецця пры дарогах, бо ў лес аўтамашынам забаронена ўязджаць. Гэтай шашой ездзяць замежныя турысты ў Белавежу, яны фатаграфуюць тое смецце, а потым выкарыстоўваюць здымкі, паказваючы, што нашу дзяржаву прымаюць у Еўрасаюз разам са смеццем.

Праз маю вёску Бялкі часам праязджаюць шыкарныя аўтамашыны на замежных нумарах. 300 метраў ад маёй сядзібы стаіць маленькая хатка, без вокнаў, дзвярэй, з рэшткамі саламянай страхі. Там заўсёды на некалькі хвілін затрымліваюцца замежныя турысты і фатаграфуюць тую хатку, якая папраўдзе псуе выгляд цэлай вёскі і ваколіцы.

Добра было б, каб нехта пацікавіўся гэтай хаткай-развалінай. Уласніцай яе з'яўляецца 80-гадовая жанчына, якая пражывае ў Доме спакойнай старасці „Самаранін" у Гайнаўцы. Па-мойму, трэба ачысціць абочыны дарог ад смецця, ліквідаваць такія хаты-страхі а потым пхацца ў Еўразаюз.

Мікалай Лук'янюк

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 85) 743 50 22.
Internet: http://www.kurier-poranny.com/niwa
E-mail: niwa@kurier-poranny.com

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury i Dziedzictwa Narodowego.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2001 r. upływa 5 czerwca 2001 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2001 r. wynosi 19,50 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 84,00; pocztą lotniczą Europa — 96,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 120,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Towarowa 28, 00-958 Warszawa. Nr konta PBK S.A. XIII Oddział Warszawa 11101053-16551-2700-1-67.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 2,80 zł, a kwartalnie — 36,40 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,10 (kwartalnie — 53,30), pocztą lotniczą: Europa — 4,70 (61,10), Ameryka Płn., Afryka — 5,30 (68,90), Ameryka Płd., Środk., Azja — 5,90 (76,70), Australia — 7,70 (100,00). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Ніўка

Дзецям — пад горку. Фота Янкі ЦЕЛУШЭЦКАГА

„Даўціпы” Андрэя Гаўрылюка

Жонка да мужа:

— Колькі ўжо разоў прасіла я цябе, каб змяніць лекара. Ён ужо такі стары і глухаваты, што яму самому неабходная апека...

— Што ж ён зноў зрабіў? Мо заляцаўся да цябе?

— Што ты! Даў мне дрэнныя лекі. Ужо трэці раз прабуе мяне атруціць...

— Дай яму яшчэ адзін шанц. Ён жа ж апекаваўся ўсімі членамі тваёй сям'і, пакуль жылі.

* * *

— Паглядзі Янка: Валодзя вязе на веласіпедзе Марусю!

— Што ж у гэтым незвычайнага?

— Гэта дамскі веласіпед.

* * *

Гутараць два сябры:

— Дрэнна выглядаеш. Штосьці цябе турбуе?

— Жонка ўцякла з нейкім малакасосам і забрала самаход...

— А якой маркі?

* * *

Пастар апавядае ўражанні пасля пропаведзі для нудыстаў.

— Ці вы не былі абураны, — пытае субяседнік, — відам такога зборышча голых цел?

— Папраўдзе — не! Толькі ўвесь час рупіла мяне, дзе ўсе яны трымаюць грошы на ахвяру.

* * *

— Пан доктар! Увайшла мне ў задніцу трэска.

— Зараз з гэтым справімся, а пакуль сядзьце на крэсла і пачакайце.

Крыжаванка



Гарызантальна: 4. вусце ракі з разгалінаваннямі, 7. гара ў Башкірыі, 1640 м., 8. індзейскае племя ў наваколлі сярэдняга цячэння Місуры, 9. зарубка на паверхні, 10. голас каня, 14. месца для пеўчых у царкве, 18. аптычны прыбор для аднаго вока, 19. няўдача, 20. мова індзейцаў Парагвая, 21. хваробатворны пачатак, які распаўсюджваецца мікробамі.

Вертыкальна: 1. лясны рабочы, 2. Яўхім, беларускі мовазнавец (1861-1931), 3. забастоўка, 4. Алесь (Аляксандр Дайлідовіч), беларускі паэт і перакладчык (1904-37), 5. Міраслава, беларуская паэтэса (нар. у 1958 г.), 6. волат, які змагаўся з багамі Алімпа, 11. функцыянер палітычнай паліцыі, 12. сок меданосных кветак, 13. яловы лес, 15. дробныя пласцінкі, якімі пакрыта цела рыб, 16. вадаём, 17. сяброўка голаду.

(Ш)

Рашэнне крыжаванкі складуць літары, пазначаныя курсівам. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку з 13 нумара

Гарызантальна: клака, прыгажуня, Лодзь, анагр, мёд, мянушка, вадапой, Ява, Арнем, понча, карцёжнік, жакет.

Вертыкальна: ламаццё, крыль, акула, падручнік, ясакарнік, ліяна, рвота, Мая, два, валёнкі, міраж, пункт.

Рашэнне: **Злосць, што лёд — да цяпла жыве**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Пальма адбівае

Дыялог пакаленняў. Вазьмі дагаварыся. Наракаюць людзі, што таго кантакту няма. Бы на іншых мовах размаўлялі. Бы той слоўнік як з іншае мовы. Або ўсім пальма адбівае кожныя дваццаць-трыццаць гадоў, каб пра што мелі пісаць і балбатаць. Ну, амаль усім. Бо на кагосьці трэба зваліць віну за тое, што не ўдаецца, што адзін аднаго слухаць не ўмее, а мо не хоча. Толькі чамусьці дзяды патрапяць дагаварыцца з унукамі, і то не з тым найменшымі (падумаў бы хто, што і старыя настолькі здзяцінелі, што той слоўнікавы запас падобны...), лепш чым з сынамі ды дочкамі. Вядома, гэта не прынцып. Але і не вылучэнне. Гэтак бывае ў жыцці. І мода вяртаецца. Так што ніколі не выкідвайце чаравікаў, плашчоў, сукенак, гальштукаў ці мушак-матылькоў — праз нейкі час можаце апрануць тое ўсё і адчуць сябе наймаднейшымі ў выкшталцонай Еўропе. Толькі што тады вашы аднагодкі скажуць, што вам тая „пальма адбіла”, бо будзеце выглядаць як ваш уласны ўнук. Ну, вядома, не ўлічваючы вопыту ды лёсу вырытых на твары. А што, кажаце, негарманічна ўсё тое будзе — ззаду ліцэй, спераду музей? Ну і хай, цяпер і ў сучасным мастацтве такая мешаніна нікога не дзівіць, і чым больш усё незразумелае, тым больш усе тыя цуды крытыка хваліць. Кінь на сябе такі ўзор, як у Лёніка на карціне — мо так як і яго цябе ў свеце ўбачаць?! Дарэчы, і Лёнік ужо ў моцна сярэдняе пакаленне ўехаў, ягоная славутая сівая латка знікла ці распасцерлася на рэшту ягонай славутай галавы, і хоць ён сам можа адчуваць не менш маладым чым, напрыклад, такі „вапняк” як я, а і маладзейшыя на наступныя дваццаць гадоў... І напэўна знойдуцца, ага, ёсць ужо такія, якія злосна пырскнуць: а што гэты стары малодзячыся дзядзька з пэндзлем кажа пра маладое, сучаснае?!. А маладыя „басаўцы” што думаюць пра мастадонтаў, што за арганізацыю біліся... дваццаць гадоў назад? То ўжо столькі часу?.. Добра, калі яны пра іх што-кольвек думаюць! Патаўсцелых, радзінных, саноўнейшых... З таўсцейшымі ці худзейшымі кашалькамі, сваімі.

Мая Агата разумее гэта так (мо жанчынам прасцей?): калі ты можаш свае маршчыны згладзіць, дык рабі ўсё, каб іх відна не было. І няма чым хваліцца, хоць кожная маршчына на мужчынскім абліччы — гэта як штых шабляй, баявыя адзнакі. Але калі пасядаюць такія ды пачынаюць пералічваць, хто што зрабіў і колькі крыві-поту ды за што праліў... Гэтак як у паліклініцы ў чарзе: хто больш ад каго хворы, хто ўжо стаіць адной нагой над магілай ды няма чаго, пане, мне зайздросціць. Ветэраны паліклінічных поляў бою, недабітыя рэформай ды адэптамі медычнай справы. Лепш ужо часам дзяцінець... А пойдзеш на скверык, дзе ля пясочніцы час бавяць бабулькі ды матулькі — то адно або пра супікі ды какікі, пластычныя аперацыі ды адсосванне тлушчу, і тыя Ізаўры-Разалінды, што зрок страцілі або памяць у той трапічнай ад пачуццяў Амерыцы...

Крутануў я тады да маладых. Мо, думаю, як да дзеда паставяцца, значыць, будзем мець кантакт нармалёвы. Падсеў я на адной імпрэзе да групкі тае моладзі, якая здалася мне адпаведнай для такога дзеда як я тусоўкай, — і па тэмпераменце, і па адносінах да свету. Панаракаць на тое сярэдняе пакаленне! І што вы думаеце? Гэтак і было! Знайшлі мы тэму, пра тых, трыццаці-саракагадовых, якія расселіся на даўно дагледжаных пазіцыях, а самі нічога не вартыя! Страчанае пакаленне! Дык трымайцеся! Ніякія крэмы вам не памогуць, ніякія аперацыі! Да наступнага дваццацігоддзя!

Вандал АРЛЯНСКІ

Рок-гіт-парад Радыё Рацыя

105.5 FM

У эфіры рок-гіт-парад гучыць кожную другую суботу а гадзіне 18.00 на хвалях Радыё Рацыя 105.5 FM. Усіх, хто цікавіцца беларускай рок-музыкай прыняць удзел у плебісцыце запрашае вядучы — Лукаш Сцепанюк. Свае прапановы можаце дасылаць па пошце (***Radio Racja, ul. Ciepła 1/7, 15-472 Białystok***) або па электроннай пошце (***radio.racja@poczta.wp.pl*** або ***stepb@poczta.wp.pl***). Для ўдзельнікаў узнагароды — магнітафонныя плёнкі з беларускай рок-музыкай.

Паясненні да спіса: першая лічба — месца, якое песня заняла ў актуальным выпуску рок-гіт-параду; другая лічба — месца, якое песня заняла ў папярэднім выпуску (два тыдні таму); трэцяя лічба — інфармацыя, колькі песня набрала ачкоў у плебісцыце.

33 выпуск, 05-05-2001 г.

1	2	153	Р.Ф. Брага, „Не гавары”
2	1	151	Ріма, „Водка”
3	6	127	Н.Р.М., „Паветраны шар”
4	4	122	Ріма, „Прывык”
5	10	94	Р.Ф. Брага, „Рэчанька”
6	3	86	Н.Р.М., „Мы жывем някепска”
7	7	79	Алесюкі, „Беларусачка”
8	8	76	Н.Р.М., „Тры чарапахі”
9	9	60	Ріма, „Дакуль мы будзем”
10	5	49	Крама, „Дай мне шанец”
11	12	44	Кардон, „Званы”
12	18	42	Я нарадзіўся тут, „Нёман”
13	14	40	Гоман, „Беларусачка”
14	11	39	Н.Р.М., „Дзед Мароз”
15	15	36	Зэт, „Баю-баю”
16	—	35	Н.Р.М., „Катлет-матлет”
17	17	34	Камелот, „Дудар”
18	20	33	А. Памідораў, „Крывавае свята”
19	—	31	Я нарадзіўся тут, „Я нарадзіўся тут”
20	15	29	Зэт, „Гэй, славяне”

Як галасаваць: песні, якая вам найбольш падабаецца прызнайце 10 балаў, 2 песні — 9 балаў, 3 — 8, 4 — 7, і г.д. аж да 10 песні, якой дайце 1 бал.